

ПАДАРОЖЖЫ, ЯКІЯ ЗАЧАРОЎВАЮЦЬ

Сямейная газета

УЗРОСТ — НЕ ПРЫСУД?

Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 СТУДЗЕНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 11 (29380)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ШАЎЦОЎ, галоўны ўрач 1-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска, старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў:**

*«Прывіваючыся ад каранавіруса, я ратую сваё жыццё, а таксама жыццё сваіх блізкіх і многіх з тых, хто са мной кантактуе, паколькі разрываю ланцуг інфіцыравання. Мае падначаленыя павінны быць матываваныя, акрамя іншага, і тым, што іх кіраўнік быў першы, хто прышчапіўся ад каранавіруса... Я — урач-інтэнсівіст і выдатна ведаю, да чаго прыводзіць каранавірус, Паверце, людзям усё роўна толькі да той пары, пакуль гэта не закране іх саміх. Тады мы жадаем не проста прышчапіцца адразу ад усіх хвароб, але нават ахвотна верым у святую ваду».*

# Развітанне з Калядой



Абрадам пад назвай «Цягнуць Каляду на дуба» на ўсходніх тэрыторыях Міншчыны і, адпаведна, на заходніх землях Магілёўшчыны ў старажытнасці развітваліся з калядными святамі. У Бярэзінскім раёне, а менавіта ў вёсцы Новіны, і сёння працягваюць гэтае вясёлае, напоўненае філасофскай і жыццёвай мудрасцю абрадавае дзейства. Як і ў ранейшыя часы, самыя актыўныя жыхары паселішча ўдзельнічаюць у провадах галоўных зімовых свят і падыманні галоўнага каляднага атрыбута — куцці — на вялікі дуб, каб быў ураджай на полі, прыбытак у гаспадарцы, працяг роду. Дзякуючы былому дырэктару мясцовага Дома культуры Ніне Клімовіч новінскаму абраду нададзены статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. А сёння эстафету захавання самабытнай традыцыі працягваюць нашчадкі Ніны Дзмітрыеўны — сын Анатоль і нявестка Святлана КЛІМОВІЧЫ *(яны на гэтым фота)*, якія таксама працуюць у вясковай установе культуры.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Плацельшчыкам транспартнага падатку ў 2021 годзе трэба будзе ўнесці авансавы плацеж да 15 снежня.**
- «Беларуснафта» ў 2021 годзе пабудуе тры АЗС і яшчэ 13 рэканструюе.
- **Камп'ютарны тамограф з'явіцца ў Рагачоўскай ЦРБ.**
- Вучоныя БДУ распрацавалі ўнікальны комплекс для дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі.
- **Фінал рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года» адбудзецца 28 студзеня ў Мінску.**
- Пераможцаў конкурсу на рэспубліканскую маладзёжную прэмію ўзнагародзяць 22 студзеня ў Мінску.
- **У Беларусі аб'ём транзітных тавараў за тры гады вырас амаль на 7 %.**

ISSN 1990 — 763X

Асоба

# ШЛЯХІ ЛЕАНІДА ЛЯВОНАВА

### Вядомы аграрый адзначыў 90-гадовы юбілей

**Ён мог бы застацца на сваёй роднай Смаленшчыне, але лёс закінуў Леаніда Лявонава ў Хаціслаў, вёску пасярод пяскоў і балот. І ён застаўся тут назаўсёды. І перамяніў гэтае месца. За паўстагоддзя работы.**



### Замест Масквы — Хаціслаў

Яго вёска Лучонкі размешчана нашмат бліжэй да Віцебска, чым да Смаленска. З ранняга дзяцінства запомнілася, што бацькі па справах ці па пакупкі выбіраліся ў Віцебск, а ў Смаленск — вельмі і вельмі рэдка. Пасля сямігодкі ён таксама паехаў у найбліжэйшы горад з намерам працягнуць адукацыю. Пазнаёміўшыся з навучальнымі ўстановамі, знайшоў тое, што найбольш падыходзіла, і падаў дакументы ў сельскагаспадарчы тэхнікум. Вытрымаў уступныя экзамены, паступіў. І ў 20 гадоў атрымаў дыплом агранома. Па размеркаванні прыехаў у Брэсцкую вобласць, з Брэста накіравалі ў Маларыту. Першым яго рабочым месцам стала пасада агранома ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі райвыканкама. Пазней яго прызначаць памочнікам начальніка палітаддзела па камсамоле.

СТАР. 14

Суперхуткая сувязь

# Беспілотны аўтобус, «зоркая» прахадная і «разумныя» скрыжаванні

### Тэхналогія 5G у Беларусі можа быць укаранёная ў найбліжэйшыя пяць гадоў

**Так, гэта цалкам рэальныя перспектывы нашага развіцця на найбліжэйшую пяцігодку. Такімі планамі падзяліўся міністр сувязі і інфарматызацыі краіны Канстанцін ШУЛЬГАН падчас прэзентацыі паслуг сувязі пятага пакалення ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень».**

СТАР. 4



Справы духоўныя

# МАГЧЫМАСЦЬ ДЛЯ КОЖНАГА

## Кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы здзейсніў чын асвячэння вады ў Свята-Духавым кафедральным саборы Мінска



**Спачатку Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі мітрапаліт Веніямін правёў набажэнства ў галоўным праваслаўным храме беларускай сталіцы, потым — на вуліцы каля храма.**

«Мы праслаўляем Спасіцеля свету, які прыняў чалавечую плоць, стаў цалкам чалавекам, такім, як мы, і тым самым пачаў свой шлях адраджэння чалавечай прыроды, якая была пашкоджаная грахом, — звярнуўся ён да вернікаў з прыступак сабора. — Праз уваход у воды ракі Іардан Ён асвяціў чалавечую прыроду. А перад гэтым асэнсавана прыняў грахі — выказаў сваю любоў і сваё вялікае змірэнне. Ён нічым не пагрэбаваў чалавечым, толькі грэх не быў Яго асабістым, а належаў усяму свету. Наколькі ж трэба любіць кожнага чалавека і ў цэлым усё чалавецтва, каб у такім прыніжальным стане — як апошні грэшнік — увaходзіць у воды ракі Іардан».

Але дзякуючы гэтаму вялікаму змірэнню і любові да чалавечага роду з'явілася і адкрылася любоў Бога Айца, напомніў уладыка і падкрэсліў, што зямное служэнне Хрыста ва ўсёй паўнаце пачалося менавіта з гэтага моманту.

Праз асвячэнне вады на свята Богаяўлення хрысціяне маюць магчымасць самі асвячацца — душой і целам.

«Важна толькі, каб мы гэта рабілі з верай і набожна, з любоўю да бліжніх сваіх», — сказаў мітрапаліт і пажадаў, каб кожны асвяціўся, натхніўся і асэнсаваў, «як шмат увесь час робіць для нас Гасподзь, і нам трэба гэта бачыць, гэтым правільна скарыстацца і праз гэта знайсці шлях свайго выратавання».

У той жа дзень мітрапаліт Веніямін здзейсніў малебен аб вылячэнні хворых у 10-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Актуальна

# 118 ТЫСЯЧ СНЕЖНЫХ «КУБОЎ» ЗА ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН

**Такіх багатых снегападаў, як сёлета, Беларусь не бачыла апошнія некалькі гадоў. За дзесяць дзён у Мінску выпала 21,6—41 мм ападкаў, што адпавядае глыбіні снегу 22—41 сантыметр, а яго колькасць спецыялісты супастаўляюць з той, што намяло падчас «Хаўеру». За гэтую зіму дарожнікі зрасходавалі на апрацоўку пакрыццяў ужо 27 тысяч тон галіту маркі А (солі) і 28,8 тысячы тон пясчана-салявой сумесі. У месцы часовага складзіравання вывезена 118 тысяч м³ снегу.**

Работы па зімовым утрыманні сталічных вуліц спецыялісты пачалі яшчэ з 15 кастрычніка, калі было арганізавана кругласутачнае дзяжурства тэхнікі. Цяпер (без выхадных) са снегам і коўзкасцю ў сталіцы вядуць барацьбу 780 прыбіральшчыкаў тэрыторыі, якія апрацоўваюць і расчышчаюць 24 млн сталічных квадратных метраў. Звычайна такіх рабочых каля 600 чалавек. На ачыстку тратуараў, пешаходных пераходаў і прыпынкаў у межах так званага рэжыму надзвычайнай сітуацыі пераводзяцца нават тыя, хто займаецца рамонтам тэхнікі, расказаў **Уладзімір ЛАТУШКАЎ, намеснік генеральнага дырэктара па ўтрыманні аб'ектаў добраўпарадкавання аб'яднання «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама»:**

— Мерапрыемствы па ліквідацыі зімовай слізкасці — гэта размеркаванне супрацьгалалёдных матэрыялаў і работы па снегаачыстцы, якія робяцца адпаведна з маршрутамі руху спецтэхнікі. Пачынаюць звычайна з небяспечных участкаў: мастоў, пуцеправодаў і вуліц, якія адносяцца да першага ўзроўню патрабаванняў. Далей абслугоўваюцца астатнія маршруты.

Усяго такіх узроўняў чатыры, і да апошняга (чацвёртага) адносяцца прысядзібная забудова і прыватны сектар. Сюды дарожнікі даязджаюць пазней, бо крытэрыі па апрацоўцы і расчыстцы тут ніжэйшыя. Перш чым апрацаваць дарогі да ідэальнага стану, нарматывамі допускаецца наяўнасць тут пэўнай колькасці снегу.

Праз моцныя снегапады колькасць дзяжурнай тэхнікі ў сталіцы ў студзені павялічылася. Звычайна на пасту каля 500 машын, а з 7 студзеня іх стала 610 і паступова дайшло да 760. Аднак гэта не значыць, што ўсе яны адразу курсіруюць па дарогах Мінска. У розных машын свае тэхналагічныя працэсы. Спачатку дарогі і тратуары апрацоўваюць сумесямі, пасля ачышчаюць ад снегу і нарэшце вывозяць яго. Дзяжурства асобных машын працягнецца да 15 красавіка, на выпадак своечасовага рэагавання на магчымае анамальнае надвор'е, — удакладніў спецыяліст.

30 % дарожнай спецтэхнікі — гэта камбінаваныя машыны, якія абсталяваны адвалам і шчоткай, ёсць солерассківальнікі, МТЗ з разнастайным абсталяваннем, грэйдары, снегапагрузчыкі. Сярод інавацый — арктык-машына, якая дазваляе працаваць на Мінскай кальцавой дарозе пры высокіх хуткасцях і здольна адкідваць снег далёка ад дарогі. Сёлета была задзейнічана і шнэкаротарная машына, якая грузіць снег з вала.

Сумесі для пасыпання дарог у Беларусі аптымальныя для нашых умоў і існуючых выкапняў: соль і пясок. Браць прыклад з Аўстрыі, дзе дарогі пасыпаюць гранітным крышывам, якое пасля збіраюць, у нас не варта, бо, па-першае, дорага, а па-другое, існуючая ў горадзе сістэма ліўневай каналізацыі проста змые ўсё гэта. Па-за межамі горада — магчыма... Перайсці на расол спрабавалі, але гэта атрымліваецца даражэй і патрабуе змены парка тэхнікі, паразважаў Уладзімір Латушкаў.

— Каб менш шкодзіць экалогіі, мы купілі ўстаноўку для прыгатавання расолу, якая дазваляе змочваць соль у машыне падчас пасыпання дарогі, каб сумесь не разляталася далёка і не трапляла на зялёную зону, а заставалася на праезнай частцы. Асабліва гэта карысна, калі машына выязджае апрацоўваць дарогу перад прагназуемымі снегападамі.

**Ірына СІДАРОК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У СААЗ заявілі аб рэкордным росце смяротнасці ад каранавіруса




За мінулы тыдзень у свеце зарэгістравана 93,8 тысячы смяротных зыходаў ад COVID-19. Рост паказчыка склаў дзевяць працэнтаў у параўнанні з папярэднім тыднем і стаў самым высокім з пачатку пандэміі. Аб гэтым сведчаць даныя на афіцыйным сайце СААЗ. Павелічэнне смяротнасці зафіксавана ва ўсіх шасці рэгіёнах, сітуацыю ў якіх адсочвае арганізацыя. Рост інфіцыравання прыкметны ў Афрыцы, Усходнім Міжземнамор'і і Заходне-Ціхаакіянскім рэгіёне. У Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы, Еўропе, Паўднёва-Усходняй Азіі гэты паказчык пачаў зніжацца ў названы перыяд. Перспектывы пакуль змрочныя — раней эксперт СААЗ па надзвычайных сітуацыях Майк Раян заклікаў рыхтавацца да 100 тысяч смерцяў да каранавіруса на тыдзень.

## Сенат Італіі выказаў давер ураду Контэ

Давер прэм'ер-міністру Італіі Джузэппэ Контэ выказалі 156 сенатараў, супраць прагаласавалі 140, а 16 устрымаліся. Напярэдадні кіраўнік урада быў падтрыманы ў ніжняй палаце італьянскага парламента. Як вядома, Савет міністраў Італіі на чале з Контэ 13 студзеня апынуўся ў сітуацыі палітычнага крызісу пасля таго, як два міністры з партыі «Італія Віва» абвясцілі аб адстаўцы. Такім чынам, кааліцыя Контэ страціла большасць у сенаце і была вымушана шукаць там новых саюзнікаў. Лідар партыі «Італія Віва» экс-прэм'ер Матэа Рэнца заявіў, што да такога рашэння прывялі дзеянні Контэ. Рэнца ўжо працягласць час выказваў нязгоду з палітыкай кіраўніка Савета міністраў па пытанні аб размеркаванні сродкаў, выдзеленых ЕС на аднаўленне італьянскай эканомікі ад пандэміі. У правых апазіцыйных італьянскіх партыях заявілі, што працягнуць дамагацца роспуску ўрада, паколькі, на іх думку, дэ-факта большасці ў сенаце у Контэ няма.

## Альпіністы ўпершыню ўзышлі на другую па вышыні вяршыню планеты зімой

Група альпіністаў з Непала стала першай, якой удалося паспяхова завяршыць зімовую спробу ўзысці на вяршыню Чагары К2. Гэта адзіны васьмітысячнік, які дагэтуль заставаўся няскораным у халодную пару. «Гэта найвялікшае дасягненне ў гісторыі альпінізму і выдатны прыклад каманднай работы», — адзначаецца ў заяве непальскага агенцтва Seven Summit Treks, якое займаецца арганізацыяй горных экспедыцый. Чагары (К2) — другая па вышыні горная вяршыня Зямлі пасля Эверэста. Яна знаходзіцца на мяжы Пакістана і Кітая ў горнай сістэме Каракарум на паўночным захадзе ад Гімалаяў. К2 усяго на 239 метраў ніжэйшая за Эверэст, але ў шмат разоў больш складаная для ўзыходжання.

Супраць COVID-19

# ВАКЦЫНАЦЫЯ ПАЧАЛАСЯ З МЕДРАБОТНІКАЎ

**У Беларусі пачалася вакцынацыя ад COVID-19. Першымі атрымліваюць прышчэпкі медыкі. У Мінску вакцынацыю пакуль робяць у трох сталічных паліклініках — 11-й, 14-й і 28-й.**

Медыцынскія ўстановы Беларусі атрымалі партыі вакцыны «Спадарожнік V» для медработнікаў. Найперш будуць прышчэплены 2 285 медработнікаў Мінска, 3 460 Брэсцкай вобласці, 3 260 — Віцебскай, 4 365 — Гомельскай, 1 735 — Гродзенскай, 1 610 — Магілёўскай, 2 485 — Мінскай. Каля 800 доз прышчэпак запланавана для медыкаў рэспубліканскіх установаў.

Практыка пачынаць вакцынацыю з медыцынскіх работнікаў характэрная і для іншых краін свету. Міністэрства аховы здароўя размеркавала вакцыну па рэгіёнах — у залежнасці ад заявак устаноў аховы здароўя. Усе пытанні захавання халадзільнага ланцуга адпрацаваныя.

Як раней адзначаў міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч, падпісаны кантракт на 170 тысяч вакцын «Спадарожнік V». Гэта першая партыя. Частку яе (20 тысяч) наша краіна атрымала яшчэ да Новага года, і яна паспела прайсці праверку якасці і бяспекі. Міністр паведаміў, што ў найбліжэйшы час паступіць новая партыя і вакцынаваць пачнуць педагогаў.

У першым квартале бягучага года сумесна з расійскімі калегамі плануецца ўжо пад беларускім брэндам выпусціць вакцыну «Спадарожнік V» на магутнасцях айчыннага прадпрыемства «Белмедпрэпараты». Прыкладна з красавіка (калі будуць прышчэплены ўразлівыя групы, а гэта медработнікі, педагогі, супрацоўнікі транспарту, гандлю, работнікі СМІ) пачнецца вакцынацыя іншых груп насельніцтва.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Імунізацыя медыцынскіх работнікаў супраць ковіда пачынаецца ў Брэсце

Гэтай навіной падзяліўся з падпісчыкамі свайго тэлеграм-канала **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.** Прышчэпачны пункт арганізаваны ў цэнтральнай паліклініцы горада. Расійскай вакцынай «Спадарожнік V» будуць прышчэпленыя ўрачы і сярэдні медыцынскі персанал гэтай і іншых медустаноў горада. У паліклініку паступіла 1200 доз першай партыі вакцыны.

Падобныя пункты неўзабаве будуць арганізаваныя ва ўсіх паліклініках горада. Пасля медыцынскіх работнікаў, вакцынацыю пройдуць работнікі сферы адукацыі і сацыяльнай абароны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Рэжым гатоўнасці

# ВЯЛІКІЯ МАРАЗЫ — ВЫСОКІЯ ЦЕПЛАПАТРЭБЫ

**Моцныя маразы, якіх Беларусь амаль не бачыла апошнія гады, прывялі 18 студзеня да пікавага спажывання электрамагутнасці ў энергасістэме краіны — 6272 МВт. Гэта адно з найбольшых значэнняў за 22 гады. Апошні раз лічба была вышэйшай за сёлетнюю ў 2013-м — тады ў студзені дасягнулі рысы 6310 МВт, паведамляюць энергетыкі.**

Разам з тым яны кажуць, што гэта толькі адзін пакуль самы марозны дзень гэтага года, і іспыт на зладжаную работу сістэм пры дадатковых нагрузках вытрыманы. Аднак маразы могуць здарыцца і ў лютым, і ў снежні, тады лічба піку спажывання можа змяніцца, а «рэкорд» адновіцца.

— Пікавае спажыванне магутнасці звязана з праходжаннем перыяду нізкіх тэмператур. Аднак не трэба блытаць пік спажывання энергіі і пік магутнасці. Калі параўноўваць з заняткамі ў спартзале, то пік магутнасці — гэта максімальная вага штангі, якую вы можаце выжаць. А максімум спажывання энергіі — тое, колькі ў суме «жалеза» вы падымеце за занятак, — правёў энергетычны лікбез **Аляксандр МАЛЬКОЎ, начальнік сектара па рабоце са СМІ аб'яднання «Белэнерга».** — У вялікія маразы людзі больш інтэнсіўна ўжываюць энергію, каб сагрэцца, і энергетыкам прыходзіцца напружвацца, каб бездакорна прайсці гэты самы пік генерацыі (выпрацоўкі) энергіі.

Айчынныя спецыялісты не толькі ўстойліва адпрацавалі перыяд пікавага спажывання магутнасці, але і дапамаглі суседзям-украінцам. У межах дагавора аб аказанні аварыйнай дапамогі за дзесяць гадзін ва Украіну адпусцілі 3,1 млн кВт·г электраэнергіі, максімальная магутнасць якой склала 500 МВт, дадаў прадстаўнік «Белэнерга».

У «Белэнерга» запэўніваюць, што цалкам гатовыя да любых нечаканасцяў падчас маразоў. Энергетыкі ўжо правялі пазачарговыя агляды абсталявання, на работу якога ўплываюць нізкія тэмпературы. Больш як 1250 аварыйна-адноўленчых і аператыўна-выязных брыгад (каля 9000 чалавек) укамплектаваны ўсімі сродкамі абароны, матэрыяламі і інструментамі. Да работы гатовыя звыш 3280 адзінак спецтэхнікі і 148 перасоўных дызельных электрастанцый.

**Ірына СІДАРОК.**




# «Мясцовым органам улады неабходна даваць больш паўнамоцтваў у вырашэнні пытанняў, якія хвалююць людзей»

**Дэлегат VI Усебеларускага народнага сходу — старшыня Чонкаўскага сельскага выканаўчага камітэта Гомельскага раёна Аляксей КОБЗАРАЎ:**



— Вельмі важна, што апошнім часам у краіне на розных узроўнях абмяркоўваюцца шляхі далейшага развіцця мясцовага самакіравання. На мой погляд, сёння мясцовым органам улады неабходна больш паўнамоцтваў у вырашэнні пытанняў, якія хвалююць людзей. Магчыма, і ў выбары стратэгіі развіцця населеных пунктаў. Зыходзячы з рэалій цяперашняга моманту, варта адзначыць, што вялікае значэнне ў павышэнні ролі мясцовага кіравання і самакіравання мае стварэнне эфектыўнага прававога механізму. Ён дазволіў бы спрасціць парадак выкарыстання сродкаў самаабкладання, якія з улікам меркаванняў жыхароў населеных пунктаў маглі б накіроўвацца на самыя неадкладныя сельскія патрэбы. Таксама, на маю думку, неабходна на заканадаўчым узроўні адрэгуляваць працэс па развіцці дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Растлумачу на рэальным прыкладзе: жыхар аднаго з пасёлкаў на тэрыторыі Чонкаўскага сельсавета прапануе адрамантаваць дарогу. Ён мае магчымасць на гэтую мэту выкарыстаць свой прыватны рэсурс і ўласныя грашовыя сродкі. Але ў якасці дапамогі ў гэтай ініцыятыве неабходна выкарыстаць тэхніку дарожнай службы. У рамках прававога поля падобнае ўзаемадзеянне прыватнай асобы і дзяржпрадпрыемства немагчымае. Тым не менш, такое супрацоўніцтва магло б паслужыць добрым стымулам для развіцця тэрыторый населеных пунктаў у далейшым. Прынамсі, сёння на тэрыторыі Чонкаўскага сельсавета актыўна вядзецца жыллёвая забудова, узводзяцца шматкватэрныя дамы ў новым мікрараёне. У 2022 годзе плануем нарошчваць тэмпы будаўніцтва па шматкватэрным жыллёвым фондзе і ў вёсцы Сеўрукі. Таму з улікам дынамічнага развіцця сельсавета існуе патрэба ў дзіцячых садках і школах. Для мясцовых жыхароў актуальнымі застаюцца і такія пытанні, як рэканструкцыя набярэжнай ракі Сож, добраўпарадкаванне пляжнай зоны, будаўніцтва сетак вонкавага асвятлення на розных участках дарог, узвядзенне дамбы, якая вырашыла б праблему падтаплення некаторых тэрыторый сельсавета.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

# «Усебеларускі народны сход — гэта дыялог, таму ўсе павінны быць пачутыя»

**Анастасія ЛЯХОЎСКАЯ, студэнтка Віцебскага філіяла ўстановы адукацыі ФПБ «Міжнародны ўніверсітэт МІТСО», член маладзёжнага парламента пры Савеце Рэспублікі:**



— Мне ўсяго 20 гадоў, браць удзел у такой падзеі буду ўпершыню. Хацелася б даведацца, якія мэты пастаўлены на наступныя пяць гадоў у краіне, а таксама падвесці вынікі мінулай пяцігодкі. Усебеларускі народны сход — гэта дыялог, таму ўсе выказаныя меркаванні павінны быць пачутыя. Мы — грамадзяне Рэспублікі Беларусь, і толькі ад нас залежыць яе будучыня. Мы заўсёды павінны пра гэта памятаць. Усебеларускі народны сход дазваляе кожнаму ахвотнаму больш шырока рэалізоўваць права ўдзелу ў справах дзяржавы. Многае залежыць ад таго, чаго хоча і што прапануе моладзь. Прыемна, што яна змяняе Айчыну ўжо цяпер, увасабляючы самыя неверагодныя ідэі і тым самым развіваючы сваю краіну.

# Зарплату трэба зарабляць, а не атрымліваць

**Дзмітрый ЧЫГІР — вядомы і паважаны чалавек не толькі на «Беларуськаліі», але і ў Салігорску. Пасля заканчэння горнахімічнага тэхнікума ў 2020 годзе ен прыйшоў працаваць машыністам горных выемачных машын на чацверты руднік. А з 2009-га яшчэ і ўзначальвае калектыў брыгады ачышчальнага комплексу лавы.**



Дзмітрый Міхайлавіч вельмі адказны і дысцыплінаваны работнік, граматны спецыяліст, умелы арганізатар, які аб'яднаў калектыў, дзе на першым месцы — узаемавыручка, адказнасць да справы. Яго брыгада — адна з найлепшых на руднiку. Дзмітрый Чыгір узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», удастоены звання «Чалавек года Міншчыны — 2014». Таму цалкам заканамерна, што яго абралі дэлегатам на Усебеларускі народны сход.

З Дзмітрыем Міхайлавічам мы сустрэліся каля яго дома, меркавалі сфатаграфаваць яго ды пацікавіцца справамі. Але ён нас з фотакарэспандэнтам запрасіў у кватэру.

Дзверы адчыніла мілавідная жанчына.

— Гэта мая жонка Вольга, — пазнаеміў нас Дзмітрый.

— Спачатку папіце кавы, перакусіце, а затым ужо распытвайце ў мужа, што вас цікавіць, — запрасіла да стала гаспадыня. — І ніякія пярэчанні не прымаюцца.

— У вашага мужа небяспечная работа, хвалюецеся, калі ён заступае на змену? — пацікавіліся ў Вольгі.

— Мы не бяром у шахту мабільны тэлефон. Выключаем і аддаем пры ўваходзе. Пасля работы перш наперш уключаю яго і бачу некалькі прапушчаных выклікаў. Набіраю нумар Вольгі і супакойваю, што ўсё нармальна. І толькі тады яна кладзецца спаць альбо займаецца хатнімі справамі, — адказвае за жонку Дзмітрый.

— Хвалюецца, значыць, яшчэ любіць, — жартуе ён.

— І ўсе ж такі цяжка працаваць у лаве? — пытаем у яго.

— Мне няма з чым параўноўваць, бо ўсё жыццё працую на адным месцы. Але часам бывае цяжкавата, за змену тры разы даводзіцца выкручваць кашулю. Таму ў шахту ідуць толькі самыя адказныя і працавітыя, тыя, хто разумее, што зарплату трэба зарабляць, а не атрымліваць, каб дастойна жыць, утрымліваць сям'ю. Узяць хоць бы нашу брыгаду. Хлопцы, як на падбор, «хварэюць» за агульную справу.

Сапраўды, гэта адзін з найлепшых калектываў, дзе адзін за ўсіх і ўсе за аднаго. Невыпадкова і справа спорыцца. Брыгада дамагаецца высокіх паказчыкаў, выдае па мільёну тон руды ў год.

Дзмітрый вырас у Салігорску, таму ведае аб праблемах простых людзей і па меры магчымасці імкнецца іх вырашаць. Невыпадкова землякі абралі яго дэпутатам раённага Савета.

Дзмітрый Чыгір лічыць, што апошнім часам Салігорск развіваецца, шмат увагі аддаецца сацыяльнай сферы, добраўпарадкаванню. У многім гораду дапамагае «Беларуськалій» — будуе новыя аб'екты, дзіцячыя садкі, жыллё. Аднак праблемы застаюцца. Напрыклад, патрабуюць удасканалення мясцовыя дарогі, а прыпаркаваныя ў дварах машыны ствараюць нязручнасці для пешаходаў. Дзмітрый Міхайлавіч — бацька двух цудоўных дзяцей — Уладзіславу шаснаццаць гадоў, Арыне хутка споўніцца пяць. Таму для малых і падлеткаў, на яго думку, павінна быць больш месцаў для забаў, адпачынку, пляцовак для заняткаў гульнявымі відамі спорту.

— А як сустрэлі навіну, што вас абралі дэлегатам на Усебеларускі сход? — удакладнілі ў суразмоўніка.

— Для мяне гэта было нечаканасцю. Лічу, што ёсць больш дастойныя кандыдатуры. Але ўсё роўна прыемна і, думаю, карысна паўдзельнічаць ў такім маштабным мерапрыемстве, паслухаць меркаванні, прапановы іншых дэлегатаў па ўладкаванні нашага жыцця, краіны.

— А якія б тэмы хацелі агучыць на форуме асабіста вы?

— На маю думку, самая галоўнае цяпер — аб'яднаць народ. Мы ўсе беларусы і павінны жыць у міры і згодзе, незалежна ад сваіх поглядаў, працаваць на развіцце і росквіт нашай агульнай Радзімы. І яшчэ варта звярнуць увагу на праблемы пенсійнай сістэмы, людзей, якія трапілі ў так званую пенсійную пастку, — выказаўся ў канцы Дзмітрый Чыгір.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

# «Самае галоўнае для кожнага — спакой у роднай Беларусі»

**Юрый КРЫВАШЭЙ, кіраўнік народнага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь сямейнага ансамбля «Жывіца» Борскага сельскага Дома культуры Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці:**



— На Усебеларускі народны сход іду з прапановай захавання, адраджэння і папулярызацыі аўтэнтычнага фальклору ў Беларусі. Лічу, што гэтай тэме вельмі важна аддаць асаблівую ўвагу, бо кожная краіна мае сваю фальклорную спадчыну: у адных яна захоўваецца, перадаецца з пакалення ў пакаленне, а ў іншых паступова забываецца і сыходзіць у нябыт. На жаль, сёння аўтэнтычны фальклор у нас перастае быць шырока распаўсюджанай культурнай з'явай, але на працягу многіх стагоддзяў з ім жыў, працаваў і адпачываў народ. Вельмі мала засталося тых майстроў, якія сваімі рукамі вырабляюць беларускія народныя інструменты: дыятанічныя цымбалы, ліры, дуды, жалейкі, дудкі. Аднак жа ў нас ёсць тыя, хто транслюе аўтэнтычную музыку, хто мог бы перадаваць маладым пакаленням беларусаў рэгіянальныя асаблівасці ігры на народных інструментах, дэманстраваць лакальную спецыфіку выканання старадаўніх песень і былін той ці іншай мясцовасці. Менавіта аўтэнтычны фальклор становіцца тым сродкам, які дае магчымасць падкрэсліць самабытнасць і ўнікальнасць нацыянальных традыцый.

Як вядома, Усебеларускі народны сход падводзіць вынікі папярэдніх пяці гадоў і ставіць задачы на наступную пяцігодку. І на сённяшні дзень адной з галоўных задач Усебеларускага народнага сходу павінна стаць выпрацоўка эфектыўных механізмаў па рашэнні першачарговых праблем, актуальных для любога грамадзяніна краіны. Самае галоўнае для практычна кожнага з нас — гэта спакой у роднай Беларусі, развіццё розных кірункаў дзейнасці, у тым ліку і далучэнне новых пакаленняў беларусаў да арыгінальнай музычнай спадчыны, узоры якой будуць трансляваца на розных фестывалях і канцэртах. Цесная сувязь з гістарычным мінулым роднай зямлі, са спецыфікай музычнай спадчыны сваёй малой радзімы, безумоўна, паспрыяе актывізацыі працэсу культурнай і нацыянальнай ідэнтыфікацыі беларусаў.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з асабістага архіва героя.**

# Беспілотны аўтобус, «зоркая» прахадная і «разумныя» скрыжаванні

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Тут жа былі прадстаўлены магчымасці ўкаранення 5G, прадэманстравана прымяненне тэхналогіі ў электронных прыладах і агавораны перспектывы работы ў дадзеным кірунку. Работа па прасоўванні 5G вядзецца ў «Вялікім камені» пачынаючы з мінулага года. У лютым 2020-га было падпісана пагадненне з Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі аб развіцці сетак пятага пакалення, а ў верасні таго ж года адбылася цырымонія перадачы абсталявання і запуску тэставай зоны 5G на тэрыторыі індустрыяльнага парку. На сённяшні дзень у «Вялікім камені» дзейнічае некалькі базавых станцый сувязі пятага пакалення, тэхналогія 5G абслугоўвае рух беспілотнага аўтобуса, а таксама элементы інжынерна-транспартнай інфраструктуры.

## ПАКРЫЦЬ ЯКАСНАЙ МАБІЛЬНАЙ СЕТКАЙ УСЮ КРАІНУ

Міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган заявіў, што пакрыць усю краіну такой мабільнай сеткай можна будзе на працягу пяці гадоў. Ён адзначыў, што пакуль няма канчатковага рашэння, калі менавіта пачнуць укараняць 5G. Пры Савеце Міністраў створана рабочая група па 5G, закліканая ўлічыць усе асаблівасці ўкаранення новай тэхналогіі. Прыкладна ў лютым будзе падрыхтавана вынікова справаздача, каб далажыць кіраўніку дзяржавы і падысці да этапу прыняцця рашэння. Далей трэба будзе ажыццявіць працэдуру выдзялення частот — магчыма, правядуць конкурсы або выкарыстаюць іншыя варыянты

На думку міністра, у нашай краіне склаліся асаблівыя ўмовы для ўкаранення сеткі пятага пакалення, і нават тыя, хто пачаў займацца гэтай тэмай раней, маштабаваць на ўсю краіну гэтую тэхналогію пакуль не змаглі. «А сённяшняя ўмовы гэта ўжо дазваляюць. Такія планы ёсць, і мы будзем над гэтым працаваць», — сказаў Канстанцін Шульган.

Зразумела, што ўкараненне тэхналогіі абыдзецца ў немалую суму, таму ўдзельнічаць могуць і прыватныя, але даволі буйныя інвестары. «Гэта сотні мільёнаў у валюце. Мы выдатна разумеем, што з бюджэту такія грошы вылучыць камусьці — напэўна, неэфектыўна і няправільна. Павінна быць канкурэнцыя. У нас дастаткова моцныя аператары сувязі, і ў іх ёсць фінансавыя магчымасці, якія дазволяць, я спадзяюся, рэалізаваць праект. Мы адкрытыя і для замежных інвестараў — сёння ў праекце ўдзельнічае кітайская карпарацыя Huawei, хай прыходзяць і іншыя», — выказаў сваё меркаванне Канстанцін Шульган.

## СЕЛЬСКІМ ТЭЛЕАПЕРАТАРАМ ТРЭБА БУДЗЕ «ПАСУНУЦЦА»

Тэставае выпрабаванне завершана: першая зона пакрыцця была разгорнута ў індустрыяльным парку, дзе сетка працуе на частаце 3,5 ГГц. Другую доследную зону «Белтэлекам» разгарнуў у Капыльскім раёне. Там упершыню ў СНД тэсціравалася сетка пятага пакалення на частаце 700 МГц. Хуткасць у сельскай мясцовасці дасягала 170 Мбіт/з, але базавая станцыя забяспечвала стабільнае пакрыццё больш чым на 4 кіламетры. Калі б у гэты раён праклалі па зямлі




Генеральны дырэктар «Белтэлекама» Юрый ПЕТРУЧЭНЯ.

валаконна-аптычны кабель, то выдаткі даводзілася б павялічыць у чатыры разы. Абсталяванне прадастаўлена кітайскай кампаніяй Huawei. Дарэчы, у Кітаі 5G выкарыстоўваецца ў камерцыйнай эксплуатацыі ўжо год, і тое, што партнёрам беларусаў выступіла менавіта гэтая кампанія, цалкам зразумела.

Для ўкаранення паслугі трэба прайсці працэдуру выдзялення частот, паколькі ў сельскай мясцовасці на частаце 700 МГц вяшчаюць некаторыя мясцовыя тэлеаператары. У Капыльскім раёне, дзе тэсціравалася паслуга, гэты дыяпазон якраз быў вольны. На працягу найбліжэйшага года аператарам прыйдзецца вызваліць рэсурс для ўкаранення новай тэхналогіі.

Па словах **генеральнага дырэктара «Белтэлекама» Юрыя ПЕТРУЧЭНІ**, унікальнасць тэхналогіі 5G у тым, што яна можа выкарыстоўвацца як у прамысловай забудове, так і ў сельскай мясцовасці. Гендырэктар «Белтэлекама» разлічвае, што новая тэхналогія дапаможа ў развіцці інтэрнэту, беспілотнага транспарту, канцэпцыі «разумных» гарадоў, а таксама зацікавіць звычайных людзей, якія будуць актыўна карыстацца магчымасцямі 5G.

## БУДУЧЫНЯ ЎЖО ПОБАЧ

Стандарт мабільнай сувязі 5G — гэта новы этап развіцця тэхналогій. Яе перавагі — высокая хуткасць доступу пры мінімальных затрымках, падтрымка мноства адначасова працуючых прылад і высокая энергаэфектыўнасць.

Хуткасць загрузкі і перадачы даных у сетцы 5G у некалькі разоў вышэй, чым у 4G. У «Вялікім камені» максімальная значэнні хуткасці дасягнулі 1,235 Гбіт/с. Тэставанне праводзілася з дапамогай смартфона Huawei P40 PRO і тэрмінала FWA Huawei 5G.

Высокая хуткасць мае прынцыповае значэнне пры рабоце з «цяжкім» кантэнтам — вялікімі відэафайламі. Звышдакладная карцінка, і ўжо не 4K, а 8K дазваляе на вялікім экране глядзець відэа без рыўкоў і завісанняў.

«Белтэлекам» аб'яднаў шырокае кола спецыялістаў, зацікаўленых у вывучэнні 5G. Аспекты рэалізацыі, перспектывы стварэння лічбавых кейсаў і іх камерцыйнага выкарыстання прапрацоўвалі прадстаўнікі ІКТ-сферы, прамысловага сектара, ВНУ і навуковай супольнасці.

«Мабільная прахадная» — праект, рэалізаваны на аснове 5G. Дзякуючы інтэграцыі з сістэмай відэакантролю ад «Белтэлекама» і спецыяльным праграмным забеспячэннем звычайны турнікет становіцца «разумным», гэта значыць з яго дапамогай можна распазнаваць асобы і кантраляваць доступ на аб'ект. Высакаскорасны абмен данымі відэакамеры і малюнкамі, раней загружанымі ў базу аддаленага сервера, дазваляе арганізаваць мабільную прахадную — аператыўна і ў любым месцы.

Яшчэ адзін кейс прысвечаны выкарыстанню 5G для рабатызаваных прылад. Калабарацыйны робат OMRON, або кобат, абсталяваны сістэмай тэхнічнага зроку. Яго камера вызначае аб'екты ў шырокім абсягу. Кобат прызначаны для работы як з людзьмі, так і з абсталяваннем. На вачах прысутных дзякуючы высакаскораснай перадачы даных быў запушчаны адзін з мноства алгарытмаў кіравання робатам. Партнёрамі ў гэтым праекце сталі ўстанова адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі» і ТАА «Балтаком Электронікс».

## ТРАНСПАРТ БЕЗ ПІЛОТА

У доследнай зоне індустрыяльнага парка рэалізуецца праект па даследаванні 5G для беспілотнага транспарту. На вуліцы парка мы змаглі паназіраць за прататыпам транспарту будучыні. Маршрут беспілотніка на Пекінскім праспекце адсочвалі камеры відэаназірання, якія транслявалі тэлевізійны сігнал у фармаце 4K. Аўтобус рухаўся ў цалкам аўтаматычным рэжыме на хуткасці 25 кіламетраў за гадзіну.

Транспартную інфраструктуру гарадоў будучыні дапоўняць і «разумныя скрыжаванні». Адно з іх ёсць абсталявана ў «Вялікім камені». Дзякуючы модулю відэааналітыкі і відэакамеры, падключанай па тэхналогіі 5G, сістэма здольная распазнаваць пешаходаў і кіраваць святлафорам, рэгулюючы рух транспарту.

## У ЛІЧБЕ ЎСЕ РОЎНЫЯ

Адна з місій кампаніі «Белтэлекам» як нацыянальнага аператара сувязі — ліквідацыя лічбавай няроўнасці. На прыкладзе Капыльскага раёна, дзе ўсталяваныя дзве базавыя станцыі, вывучаецца мадэль пабудовы сеткі для аказання лічбавых паслуг у сельскай мясцовасці. Дыяпазон 700 МГц забяспечвае максімальную зону пакрыцця. У пілотнай зоне таксама адпрацоўвалася ўзаемадзеянне аператараў «Белтэлекама» і СТАА «Мабільныя Тэлесістэмы» пры пабудове сеткі 5G.

З дапамогай гэтай сеткі «Белтэлекам» падаў пакет сучасных паслуг сувязі там, дзе на стварэнне валаконна-аптычнай інфраструктуры спатрэбілася б значна больш часу і фінансавых укладанняў. Так, жыхарка вёскі Якубавічы Капыльскага раёна змагла першай пратэставаць высакаскорасны пакет паслуг «Яснае 100 SMART» і паслугу «Відэакантроль», далучаныя па сетцы 5G. У доме, дзе не было валаконна-аптычнай сеткі, з'явіліся безлімітны інтэрнэт на хуткасці 100/50 Мбіт/с і больш за 115 тэлевізійных каналаў у лічбавай якасці.

**Сяргей КУРКАЦ,
фота аўтара.**


**УП «Белконфискат»
объявляет о проведении электронных торгов
09.02.2021 г.**
по продаже имущества Возняк С. Н. автомобиль «Citroen Berlingo» 2008 г. в, начальной стоимостью 3200 рублей. На сайте belkonfiskat.by размещена информация о торгах. Справки по тел. 8 (017) 3639489.
УНН 190431606

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.
**Продавец:** открытое акционерное общество «ВИСТАН» 210627, г. Витебск, ул. Димитрова, 36/7, тел.: 8 (0212) 608605, 8 (0212) 60-85-95.
**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-190272, площадью – 291,3 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23-2. Изолированное помещение с инв. № 200/D-190274, площадью – 229,8 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административно-торговое помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23-4. Изолированное помещение с инв. № 200/D-190909, площадью – 1800,6 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23-5. Расположено на 1-м, 2-м этажах.
**Нач. цена:** 811 680,00 бел. руб. с учетом НДС.
Задаток: 81 168,00 бел. руб.
**Лот № 2.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-190273, площадью – 300,5 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23-3. Расположено на 1-м, 2-м этажах.
**Нач. цена:** 114 000,00 бел. руб. с учетом НДС.
Задаток: 11 400,00 бел. руб.
**Дата, время и место проведения торгов: 23.02.2020 в 11.00 по адресу:** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 21.01.2021 с 08.30 по 22.02.2021 до 17.30. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000002000413 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36 (право аренды).
**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г.Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566**. **Условия аукциона:** победитель торгов (единственный участник торгов) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов; в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения торгов возместить затраты по подготовке документации на р/с, указанный в протоколе торгов (лот № 1 – 1985,61 бел. руб. с НДС 20 %, лот № 2 – 483,93 бел. руб. с НДС 20 %); подписать договор купли–продажи в течение 15 рабочих дней с даты проведения торгов, оплатить предмет торгов в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли–продажи. **Аукцион проводится** в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (33) 378-57-36, +375(212) 60-85-95 Титок Оксана Михайловна.

**Открытое акционерное общество
«Дорожно-строительный трест № 3»
10 февраля 2021 года в 12.00 проводит открытый аукцион
по продаже имущества.**

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Автомобиль ZIL-MMZ-4502, тип транспортного средства – грузовой специальный самосвал, год выпуска не определен, инвентарный номер 1221 | 920,00 | 92,00 |
| Лот № 2 | Погрузчик «АМКОДОР 332С4», тип транспортного средства – погрузчик фронтальный 2006 года выпуска, инвентарный номер 794 | 23 700,00 | 2370,00 |
| Лот № 3 | Полуприцеп KAZ 9368, тип транспортного средства – полуприцеп бортовой, год выпуска не определен, инвентарный номер 581 | 960,00 | 96,00 |
| Лот № 4 | Полуприцеп MAZ 9379, тип транспортного средства – полуприцеп платформа 1998 года выпуска, инвентарный номер 756 | 6 300,00 | 630,00 |
| Лот № 5 | Автомобиль UAZ 23632 232, тип транспортного средства – грузовой пикап 2010 года выпуска, инвентарный номер 601 | 5 300,00 | 530,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **10 февраля 2021 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 08.02.2021 г., время: 17.00.
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
8. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размешены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

# ПАДАРУНКАЎ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

*Першы свой падарунак у гэтыя калядна-навагодня дні мой двухгадовы сынок заўважыў пад ёлкай на каталіцкую куццю — паклапаціліся бабуля з дзядулем, мае бацькі (толькі дзеля аднаго гэтага моманту, калі малое знаходзіць прэзент, варта ўпрыгожваць ёлачку: несхаваная дзіцячая радасць дарагога варта!). Дык вось, трымае Цёмік у сваіх маленькіх ручках такі жаданы трактар з прычэпам, спрабуе ў яго пагрузіць каштаны, яшчэ восенню сабраныя, як раптам выдае: «А чаму Дзед Мароз кран не прынёс?»*

*Мы да такога пытання падрыхтаваныя не былі. Сапраўды, калі я напярэдадні свят пыталася ў Арцёмкі, што ён хоча ўбачыць пад ёлачкай, малы, доўга не думаючы, агучыў свае мары-жаданні: трактар (хоць іх у яго поўна!), пад'ёмны кран, «чух-чух» (цягнік) і смеццявоз. Святы толькі пачаліся, пад'ёмны кран, як і іншыя падарункі, чакалі свайго часу ў надзейным месцы, але як мне растлумачыць дзіцяці, чаму Дзед Мароз не прынёс усё адразу?!*

*Праз некалькі дзён інтрыга раскрылася. Якраз перад Новым годам мы з Цёмікам пайшлі пагуляць да яго брацікa і сястрычкі, дзяцей мужавай стрыечнай сястры. Света нас запрасіла наўмысна, папярэдзіўшы, каб я ўзяла з сабой які-небудзь з падарункаў, падрыхтаваных малому на свята: увечары яны (дзеці пра гэта нават не здагадваліся) чакалі Дзеда Мароза і Снягурку, якія за грошы сёння да каго заўгодна прыйдуць. Таму пакуль Арцём у абед спаў, я загадзя завезла сваячцы пад'ёмны кран, а то малы абавязкова спытае, што я нясу з сабой, альбо ўвогуле загляне ў маю торбачку — і плакаў тады Дзед Мароз, вера ў якога ў майго сына яшчэ вельмі моцная. Адным словам, канспірацыя захавалася, дзеці і нават мы, іх бацькі, былі вельмі задаволеныя. Цёмік і сёння расказвае ўсім, што бачыў жывога Дзеда Мароза.*

*Праўда, апошні малому з'яўляўся і пасля: яшчэ на працягу некалькіх дзён (свят жа шмат!) мы знаходзілі пад ёлачкай падарункі. Пройдзе час, і Цёма даведаецца, што дзякаваць за спраўджаныя жаданні трэба не казачнаму персанажу (хоць і яму «дзякуй», бо цяпер мой сынок не адварочваецца ад кашы і спрабуе быць паслухмяным, што звычайна не заўсёды атрымліваецца), а бацькам, бабулям, дзеду, хросным, шматлікім сваякам і нават мамчынай рабоце, якая хоць і не шакаладная фабрыка, але перад святамі выдае цукеркі. Пашанцавала Цёміку яшчэ і перад Старым Новым годам — з далёкага Віцебска ў нашу вёску прыйшла пасылка (пра свайго любімчыка не забылася хросная мама). Трэба было бачыць, з якім гонарам мой маленькі сынок вёз з пошты на санках гэты вялікі пакунак, з якой радасцю потым распакоўваў і ей.*

*Ці было столькі падарункаў у вашым дзяцінстве? Не, не было ў такой колькасці іх нават у маім. Адных толькі цукерак Цёмік атрымаў пяць пакункаў. У мяне ж у свой час было ўсяго два, ЦЭЛЫХ два: адзін давалі маме-настаўніцы, другі з калгаса прыносіў бацька. Малому, які запар можа з'есці пяць цукерак (каб я дала дазвол, то і больш) не зразумець, як яго маці калісьці выдзяляла сабе па дзве на дзень, спрабуючы надаўжэй расцягнуць гэтую смакату. Не буду прыбядняцца: у сваім дзяцінстве пад ёлкай знаходзіла падарунак і я (нягледзячы на складаныя 90-я, бацькі не забываліся пацешыць нас з братам). Нам так карцела даведацца, што ж прынясе Дзед Мароз, у якога мы ўжо, канешне, не верылі, што за некалькі дзён да запаветнага дня мы абавязкова наладжвалі цэлую пошукавую аперацыю па кватэры. І часам знаходзілі, але ў самы важны момант рабілі выгляд, што нават не чакалі такіх падарункаў. Падарунка. У нас іх было па адным, але гэта не перашкаджала нам быць самымі шчаслівымі дзецьмі ў свеце.*

*Але гэта было зусім іншае стагоддзе, нават тысячагоддзе. Вернемся да дня сённяшняга. Скончылася святочная мітусня. Жывём у ранейшым рэжыме. Арцём зрэдку забаўляецца з пад'ёмным кранам, ужо забыўся на трактар з прычэпам і, калі нагадаеш, пускае свой цягнік па пластмасавай чыгунцы. Усё часцей глядзіць мульцікі, «дапамагае» мне на кухні (то шклянкі з крупой павыварочвае, то ў сланечнікавым алеі «памые» рукі, то панаціскае на клавішы мікрахвалёўкі), «займаецца» акрабатыкай на стале, на парэнчах канапы, «адточвае» бантутныя трукі на вялікім ложку бабулі і дзядулі.*

*На дзіва, малы быў не супраць таго, каб мы разабралі ёлку (летась я рабіла гэта, калі ён спаў). Цёмка асцярожна здымаў шарыкі з лапак (памятае, відаць, што было за пабітую цацку, калі ўпрыгожвалі ёлку), як раптам у маленькага чалавека ўзнікла прапанова: «Можа, не будзем спяшацца? Дзед Мароз яшчэ кран пад ёлку не паклаў!» Паўза. Усяго некалькі дзён прайшло, а Цёмік ужо забыўся, што гэтую самую машыну казачны дзед уручыў яму асабіста ў рукі. Праз хвіліну высветлілася, што з памяцці ў маёй малечы ўсё ў парадку: ён проста «два пад'ёмныя краны хацеў».*

*З трывогай чакаю наступнага Новага года...*

**Вераніка КАНЮТА.**

Сямейная газета

Выпуск № 1 (160)

Тыя, хто побач

## Гюнэш АБАСАВА:

# «МНЕ ЗДАЕЦЦА, ШТО МЫ МУЖ І ЖОНКА НЕ СЕМ ГАДОЎ, А НАШМАТ БОЛЕЙ»



**У рабочым графіку беларускай спявачкі Гюнэш, нягледзячы на няпростую сітуацыю з пандэміяй, вольных гадзін усё роўна не хапае — яна працуе ў студыі гуказапісу, піша музыку, робіць прадакшн, рыхтуе маладых артыстаў да конкурсаў, выступае ў якасці члена журы... Аднак усё гэта не можа задавальняць артыстку, калі побач няма галоўнага — падтрымкі, апоры — яе сям'і. Пра гэта мы пагаварылі са спявачкай, сустрэўшыся з ёю пасля канцэрта ва ўтульнай кавярні недалёка ад яе роднага Маладзёжнага тэатра эстрады...**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Юрыдычны лікбез

# ПРАВА НА СЛОВА,

## але не на цуд

**Часам здараецца, што дзеці парушаюць закон ненаўмысна. Аднак разабраць віну непаўналетняга і абараніць яго правы — справа абавязковая як для абвінаваўцы, так і для абаронцы. У папярэднім нумары «СГ» з дапамогай эксперта Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў падчас вебінара, які арганізаваў Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі, мы разбіралі, што трэба рабіць і ведаць, калі непаўналетні становіцца падазроным ці абвінавачваным. Сёння паспрабуем разабрацца, чаму ў крымінальным працэсе гэтак важныя педагог і пратакол, а таксама даведаемся, як трэба сябе паводзіць падлеткам.**



### Роля педагога

Непаўналетні ніколі не застаецца безабаронны — так устроены Крымінальны кодэкс краіны, дзе для дзяцей, якія парушылі закон, прадугледжаны асаблівыя ўмовы падчас разгляду справы, сцвярджаюць спецыялісты. Аднак на практыцы можа спрацаваць так званы чалавечы фактар: нехта пра нешта забыўся, пра нешта не дагаварыў, нешта не так зразумеў. Нават дарослым бывае цяжка валодаць сабой у нестандартных сітуацыях, што казаць пра падлеткаў. Менавіта таму важна, каб побач з абвінавачваным непаўналетнім быў дарослы, якога ён ведае.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Азбука бяспекі

# НАВУЧЫЦЬ ДЗЯЦЕЙ БАЧЫЦЬ ХЛУСНЮ

## Бацькі змогуць праверыць анлайн, ці ведаюць дзеці правілы бяспекі ў інтэрнэце і на вуліцы

На сайце smartparent.by запушчаны тры сюжэтныя анлайн-тэсты ў фармаце інтэрактыўных гульняў «На пляцоўцы», «У інтэрнэце» і «У спартыўнай секцыі». Яны адаптаваныя для розных узростаў. Прайшоўшы іх, дзеці і бацькі змогуць у гульнявой форме навучыцца бяспечным паводзінам на вуліцы і ў сеціве, а таксама атрымаюць рэкамендацыі па мадэлях паводзін у сітуацыях, якія могуць уяўляць рызыку для бяспекі.

Тэсты сталі часткай кампаніі «Навучыць дзяцей бачыць хлусню». Мэта кампаніі — прадухіліць сексуальную эксплуатацыю дзяцей праз адкрыты дыялог аб праблеме гвалту ў рэальным і віртуальным жыцці і яго наступствах. А ў выпадках, калі такую сітуацыю прадухіліць не ўдалося, — мінімізаваць негатыўныя наступствы для дзіцяці, дапамагчы яму своечасова распазнаць небяспеку і звярнуцца па дапамогу.

Арганізатарам кампаніі «Навучыць дзяцей бачыць хлусню» выступае прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Беларусі. Таксама да праекта далучылася арганізацыя «SOS Дзіцячыя вёскі».

Гульнявы анлайн-тэст «На пляцоўцы» прызначаны для дзяцей ва ўзросце 5-8 гадоў і іх бацькоў. У ім абыгрываюцца сітуацыі, калі незнаёмыя людзі звяртаюцца да дзіцяці на вуліцы: просяць яго аб дапамозе, прапануюць пачастунак, утрымліваць сілай і іншыя. Пасля кожнай на экране ўсплывае каментарый да абранага варыянту паводзін або рэкамендацыя па бяспечных паводзінах.

Інтэрактыўны тэст «У інтэрнэце» прызначаны для дзяцей 8-12 гадоў і іх бацькоў. Ён ахоплівае этапы рэгістрацыі акаўнтаў у сацыяльных сетках, магчымыя мадэлі зносін з незнаёмцамі анлайн, бацькоўскі кантроль, а таксама тлумачыць, як дзейнічаць у выпадках шантажу і пагроз. У тэсце прадстаўлены парады спецыялістаў па правілах паводзін у такіх сітуацыях.

Аўдыторыя тэста «У спартыўнай секцыі» — падлеткі ва ўзросце ад 12 да 15 гадоў і іх бацькі. У ім закранаюцца небяспечныя наступствы прыхільнасці дзіцяці да дарослага педагога, а таксама шантаж падлетка і прымус захоўваць усё ў сакрэце.

Таксама ў межах кампаніі «Навучыць дзяцей бачыць хлусню» іх увазе прапануюцца тры інфармацыйныя ток-шоу, у якіх псіхолагі, юрысты і спецыялісты ў галіне дзіцячага выхавання ўзнімаюць важныя тэмы, звязаныя з сексуальнай эксплуатацыяй дзяцей, даюць практычныя парады бацькам і настаўнікам, як гаварыць з дзецьмі пра гвалт, як выбудоўваць сяброўскія адносіны і чым дапамагчы ў выпадку наступлення траўмавальнага вопыту. Ток-шоу даступнае для прагляду бясплатна на YouTube-канале.

Калі вам патрабуецца кансультацыя пра тое, як пагаварыць з дзіцем на тэму сексуальнага гвалту і куды звярнуцца па дапамогу, неадкладна тэлефануйце на бясплатную «гарачую лінію» па нумары 8-801-201-5555.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПРАВА НА СЛОВА...




**ВАЖНА ВЕДАЦЬ**

Калі непаўналетняму, які здзейсніў злачынства, падчас вядзення справы спаўняецца 18 гадоў, то паўнамоцтвы яго законнага прадстаўніка (бацькоў, усынавіцеляў, папячыцеляў ці іншых асоб, якія прадстаўляюць інтарэсы непаўналетняга) спыняюцца на любой стадыі разгляду крымінальнай справы, ці гэта даследаванне, ці судовы разгляд. Аднак спыніць удзел абаронцы ці педагога ў справе немагчыма, нават калі абвінавачваны падлетак стаў паўналетнім.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Мяркуецца, што педагог са школы ці іншай установы, дзе вучыцца дзіця, можа даць яму псіхалагічную апору, якая стане гарантыяй для падлетка, што нічога з ім не здарыцца падчас следчых дзеянняў, — падкрэсліла **Вольга БАРАНЧЫК, адвакат Мінскай абласной юрыдычнай кансультацыі № 1.** — Педагог можа наладзіць з ім кантакт, якога ў непаўналетняга не ўзнікае нават з адвакатам, а тым больш са следчым. Не заўжды можна знайсці агульную мову з «яршыстымі» падлеткамі, таму і запрашаюць столькі людзей (законных прадстаўнікоў, педагога, абаронцу), каб непаўналетні не закрыўся ў сабе і з ім можна было працаваць. Педагогі маюць адпаведную ступень псіхалагічнай падрыхтоўкі для кантактавання з дзецьмі, якой няма ў адвакатаў і бацькоў дзяцей, таму іх удзел у справе вельмі важны.

### З 16 гадоў і з 14

Увогуле, да крымінальнай адказнасці можна прыцягнуць асобу, якая дасягнула на момант здзяйснення злачынства 16 гадоў. Да 14-годдзя падлетак не падлягае крымінальнай адказнасці. Аднак у частцы 2 артыкула 27 Крымінальнага кодэкса (КК) Беларусі ў 22 пунктах указаны састаў злачынстваў, за якія прадугледжана крымінальная адказнасць і з 14 гадоў. Найперш гэта забойства, прычыненне смерці па неасцярожнасці, наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, наўмыснае прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання, сексуальнае гвалтаванне, гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару, выкраданне чалавека, крадзяжы, грабяжы, разбой, вымаганне, крадзеж з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі.

Крымінальная адказнасць з 14 гадоў наступае і за ўгон транспартнага сродку (маламернага судна), наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне маёмасці, захоп заложнікаў, крадзеж агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў. За наўмыснае прывядзенне да непрыгоднасці транспартнага сродку або шляхоў зносін (найчасцей сустракаецца ў рэгіёнах) адказнасць прадугледжана артыкулам 309 КК Беларусі. За крадзеж наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў (артыкул 327 КК Беларусі), незаконны абарот наркотыкаў (часткі 2-5 атрыкула 328 КК Беларусі), хуліганства (артыкул 339 КК Беларусі) таксама можа наступіць крымінальная адказнасць з 14 гадоў.

Вельмі распаўсюджаным стаў артыкул 340 КК Беларусі за заведама непраўдзівае паведамленне аб небяспецы. За такі жарт 14-гадовага таксама прыцягнуць да крымінальнай адказнасці. Як і за апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці. Крымінальная адказнасць прадугледжана з 14 і за ўцёкі з папраўчай установы, дзе адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, з арыштнага дома ці з-пад варты, за ўхіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі.

— Пры гэтым не падлягаюць крымінальнай адказнасці некаторыя непаўналетнія, якія ўжо дасягнулі ўзросту крымінальнай адказнасці. Напрыклад, калі будзе ўстаноўлена, што асоба ў выніку адставання ў псіхічным развіцці, не звязанага з псіхічным расстройствам (захворваннем), у час здзяйснення грамадска небяспечнага ўчынку была няздольная ўсведамляць яго фактычны характар і небяспеку, — дадала Вольга Баранчык. — Да такіх падлеткаў прымяняюцца іншыя меры. Яны лічацца асобамі, якія здзейснілі грамадска небяспечнае дзеянне.


vop.ru

### «З маіх слоў запісана недакладна»

Падчас правядзення следчых дзеянняў, у прыватнасці, пры допыце падазронага, абаронца і педагог маюць права з дазволу следчага ці пракурора задаваць пытанні падлетку, знаёміцца з пратаколам, рабіць пісьмовыя заўвагі аб правільнасці і паўнаце запісаў паказанняў непаўналетняга.

— Пратаколы допытаў могуць быць абвешчаны на судовых пасяджэннях, і на падставе паказанняў, змешчаных у іх, можа будавацца абвінавачванне непаўналетняга. Таму да гэтых дакументаў трэба ставіцца вельмі адказна. Нават калі следчы неахвотна ідзе на гэта, трэба ўважліва іх чытаць, прасочваць паўнату фразы, сказанай падлеткам, ці звяртаць увагу на тое, што яна недакладна запісана, што зменены сэнс сказанага, настойваць на праўках, — раіць адвакат. — Часта гэта пасля вырашае лёс непаўналетняга, бо ў такім узросце падлеткі яшчэ не ў поўнай меры могуць разумець, пра што яны гавораць. Яны схільныя да фантазій і перабольшванняў праз яшчэ несфарміраваную псіхіку. А ёсць дзеці, якія міжволі падманваюць, выкручваюцца.

Абавязкова чытайце пратакол! Калі інфармацыя ў ім выкладзена не так, як вы казалі, прасіце ўнесці праўкі, нават калі следчы кажа, што «пратакол складзены, мяняць нічога не будзем».

### Часам лепш прамаўчаць

Існуе шмат мер стрымання непаўналетняга: падпіска аб нявыездзе, асабістае паручыцельства законнага прадстаўніка, заклад, дамашні арышт, зняволенне пад варту.

— На жаль, апошняя мера ў дачыненні да непаўналетніх цяпер самая распаўсюджаная, хоць павінна быць выключнай. Ніколі не саромейцеся задаваць пытанні, «што зараз адбываецца», «што са мной будзе» і іншыя, — раіць падлеткам Вольга Баранчык. — Не бойцеся, што ваша маўчанне да прыходу маці будзе ацэньвацца супраць вас. Вы маеце права маўчаць. Часта гэта бывае нават карысна, бо не заўжды без удзелу абаронцы ці бацькоў вы можаце сфармуляваць свае думкі.

**99 % падлеткаў, сутыкаючыся са спакусай парушыць закон дзеля забавы ці нязначнай спажывы, думаюць, што іх не зловяць. Аднак у час сучасных тэхналогій такога амаль не здараецца.**

Але калі падлетак свядома пайшоў на ўчынак, які супярэчыць закону, значыць, ён павінен разумець, што за гэта наступіць адказнасць у любым выпадку, — кажа кіруючы **партнёр адваката бюро Максім ЦЕРАШКОЎ.**

— Калі вы ўжо ў кабінеце следчага, ніякіх скідак на тое, што «гэта ж дзіця», акрамя тых, што прадугледжаны законам, не будзе. І пазбегнуць пакарання, спасылаючыся на тое, што «я малы, я не ведаў, я пажартаваў», не атрымаецца.

— Крымінальная адказнасць не вартая таго, каб паказаць сябрам, які ты круты. І мы гаворым не пра тое, як пазбегнуць пакарання, а як не зрабіць выбар на карысць парушэння закона, — удакладніў Максім Церашкоў.

Адно з самых распаўсюджаных працэсуальных дзеянняў з удзелам непаўналетніх па крымінальных справах — непасрэдна допыт, і тут ёсць нюансы.

— Допыт павінен цягнуцца не больш за дзве гадзіны. Але калі вы бачыце, што дзіця «паплыло», стала неўважлівае, пагаджаецца з усім і адказвае, не разумеючы сутнасць пытання, прасіце перапынак, — раіць педагогам і абаронцам падлеткаў адвакат бюро. — Гэта робіцца, каб зафіксаваць у пратаколе допыту аб'ектыўныя паказанні і выкласці толькі тое, што сказаў непаўналетні. Ніякіх дадумванняў следчага, ніякіх «пад гэтым маецца на ўвазе» тут быць не павінна.

Пры разглядзе справы не павінна быць ніякіх сімпатый ці прадузятасцяў. Калі педагог, абаронца ці сам непаўналетні бачаць, што следчы ставіцца прадузята, пачынае выкарыстоўваць фразы накшталт «ты ўсё роўна сядзеш» або «я запішу так, як мне хочацца», то можна ўзяць адвод следчага.

— Адвод — выражэнне акту недаверу да следчага, які, напрыклад, праводзіць стадыю папярэдняга расследавання. Тое ж самае датычыцца і адводу суддзі, калі ён дазваляе сабе ацэнку таго, што адбываецца. Хоць на практыцы задавальненне адводаў сустракаецца не так часта, таму што ён павінен быць дакладна матываваны. Калі следчы проста строгі, то адвод ніхто не задаволіць, але пра яго магчымасць трэба ведаць, — упэўнены Максім Церашкоў.

**Ірына СІДАРОК.**

**УНІВЕРСАЛЬНЫЯ ПАРАДЫ**

• Калі пасля затрымання з нейкіх прычын адсутнічае адвакат, і яго не даюць, — гэта парушэнне працэсуальных правоў і артыкула 62 Канстытуцыі Беларусі, дзе сказана, што кожны мае права на атрыманне юрыдычнай дапамогі без абмежаванняў у часе і ў любым месцы канфідэнцыйна (незалежна ад таго падазраваны ён ці абвінавачваны). Ніводзін дакумент не будзе мець юрыдычнай сілы, пакуль у непаўналетняга не з'явіцца абаронца.

• Калі падлетка затрымалі, не далі адваката і настойваюць на падпісанні якіх-небудзь дакументаў, трэба ўважліва чытаць іх і правяраць, ці адпавядае іх змест сказанаму. Калі не адпавядае, то, перш чым падпісаць дакумент, неабходна ўказаць, што ў ім пазначана дакладна, а што недакладна.

• Заявы накшталт таго, што «мы цябе затрымалі, адваката табе не дадзім, але калі ты падпішаш гэты дакумент, дзе сказана, што ты прызнаеш сваю віну і каешся ва ўчыненым, то мы цябе адпусцім», — парушэнне закона. Затрыманне з'яўляецца мерай стрымання, але яно абавязкова скончыцца, асабліва калі для яго няма падстаў, нават калі ваш «сябра» вас абгаварыў.

• Памятайце, што падпісанне дакумента, у якім указана не тое, што вы казалі (без якіхсьці вашых заўваг ці пярэчанняў), прыраўноўваецца да прызнання фактаў, выкладзеных у дакуменце, які вы падпісалі. Падпісанне прызнання ў здзяйсненні злачынства, якога вы ў сапраўднасці не рабілі (без вашых заўваг ці пярэчанняў), прыраўноўваецца да прызнання ў гэтым злачынстве.

• Калі вашы правы парушаны, вы можаце звярнуцца да пракурора, паколькі пракуратура здзяйсняе нагляд за выкананнем заканадаўства Беларусі, нават калі з вас смяюцца і кажуць «ды хто ты такі?».

# «МНЕ ЗДАЕЦЦА, ШТО МЫ МУЖ І ЖОНКА НЕ СЕМ ГАДОЎ, А НАШМАТ БОЛЕЙ»



## БЕЛАРУСКАЯ «ДАЧКА УСХОДУ»

***— Як так адбылося, што вы, генетычная азербайджанка, нарадзіліся і жывяце ў Беларусі?***

— Мой бацька нарадзіўся ў Азербайджане, а калі надышоў час ісці ў армію, яго накіравалі ў Ленінград. Аднойчы, на выхадныя, ён прыехаў у госці да свайго старэйшага брата, які жыў на той момант у Баранавічах, яму вельмі спадабаўся гэты горад. Пасля ён вярнуўся ў Азербайджан, там сустрэў маю маму, яны пабраліся шлюбам, і бацька прывёз яе сюды, у Беларусь. Ужо больш за 40 гадоў яны жывуць у гэтым горадзе і жыцця не ўяўляюць у іншым месцы.

Калі намаляваць маё дзяцінства, то колер аранжавы. Калі сказаць, што ў дзяцінстве я была вельмі ціхім дзіцем у адрозненне ад майго брата, зараз ніхто не паверыў бы. Звычайна бацькі атрымлівалі лісты падзякі за добрае выхаванне і старанную вучобу дачкі ды чарговую заўвагу за дрэнныя паводзіны сына. Аднак усё змянілася: брат стаў ціхім, а я — наадварот. Я наведвала розныя гурткі, вязала шыдэлкам — да гэтага часу матуля захоўвае мае работы, у доме былі і хамячкі, і вожыкі, і папугайчыкі. Займалася фехтаваннем — ледзь не забралі ў вялікі спорт. Аднак музыка перамагла, цяпер займаюся толькі ёй *(смяецца)*.

***— Цікавая гісторыя сустрэчы вашых бацькоў, ваша дзяцінства... А вы ўяўлялі, якой будзе ваша сям'я і хто будзе абраннікам?***

— Мяне заўсёды прываблівае ўсходні тыпаж мужчыны, аднак тое, што маім мужам будзе футбаліст з Турцыі, я нават уявіць не магла. Увогуле, не важна, якой нацыянальнасці абраннік, галоўнае, каб гэта быў твой чалавек, твая другая палавінка.

Мой каханы, Гёкхан, знайшоў мяне праз інтэрнэт, аднак убачыў упершыню па тэлевізары, калі я выступала на конкурсе Istanbul Songs: я здзівіла яго і яго сяброў сваім голасам і тым, што цудоўна спявала па-турэцку. Калі надышоў час прапановы рукі і сэрца, я паставіла Гёкхану ўмову — калі не пераедзе ў Мінск, значыць, мы разыходзімся (на той момант ён працаваў футбольным трэнерам на Кіпры і лічыў гэтае месца неверагодным). Пасля такога канфлікту мы не размаўлялі месяцы тры. І ў адзін цудоўны момант каханы проста сабраў чамаданы, прыехаў і сказаў: «Ну, паказвай свой край!» *(смяецца)*. Вось ужо сем гадоў, як мы жанатыя, і калі спытаеце ў майго мужа, у якую краіну паедзем жыць, ён адкажа, што адсюль нікуды не паедзе, каханы палюбіў сталіцу, так што Беларусь — наш край.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

## «ТЫ МАЯ, І ЎСЁ ТУТ!»

***— Як Гёкхан зрабіў вам прапанову?***

— Ведаеце, як усходнія мужчыны робяць прапанову? Ты мая, і ўсё тут! *(Смяецца.)* А калі сур'ёзна, то пасля двух гадоў адносін і паездак адно да аднаго (а гэта складана і фізічна, і фінансава) неабходна было нешта вырашаць, бо хацелася ўжо стварыць сям'ю. Пазнаёміліся з бацькамі, пачалі рыхтавацца да вяселля. А вось рукі і сэрца, ды так, каб на калена — такога не было. Дарэчы, неабходна спытаць, чаму? *(Смяецца.)*

Мы распісаліся ў Мінску, а вяселле згулялі ў Стамбуле, бо ў Гёкхана шмат сяброў, родных — гасцей было каля 600—700, святкавалі наш дзень у вялікім палацы, як прынята ў Турцыі. Дарэчы, у туркаў ёсць цікавая традыцыя — пасля ўрачыстай цырымоніі госці адорваюць нявесту: на яе надзяваецца белая стужка з кішэнькамі, куды кладуць грошы альбо чапляюць спецыяльныя залатыя манеты на шпількі. Уяўляеце, колькі ўсяго было на мне — стаяла нібы навагодняя ёлка! *(Смяецца.)*

***— Ці ўдалося Гёкхану знайсці сябе ў Беларусі?***

— Гёкхан — прафесійны футбаліст, іграў у вышэйшай лізе за знакаміты турэцкі клуб «Галатасарай». Цяпер пры садзейнічанні пасла Турцыі ў Рэспубліцы Беларусь муж стварыў футбольную каманду «Цюркспорт». У Беларусі гэта першая і пакуль адзіная турэцкая каманда, куды ўваходзяць супрацоўнікі пасольства Турцыі, а таксама турэцкія грамадзяне, што жывуць у Беларусі. Гэтай справай Гёкхан падкрэслівае сяброўства паміж нашымі роднымі краінамі. Каманда прымае ўдзел у дабрачынных турнірах і акцыях, дапамагае дзіцячым дамам. У мужа ёсць мара стварыць сваю футбольную школу, каб перадаваць веды беларускім дзецям, якія ў будучым змогуць прадстаўляць нашу Беларусь на футбольнай арэне.

## СЯМЕЙНЫЯ СТАСУНКІ

***— Якія якасці мужа больш за ўсё шануеце?***

— Мой абраннік добра выхаваны, у яго цудоўная сям'я, адукацыя. Мне падабаецца, што сужэнец не ўмешваецца ў маю прафесію, што падтрымлівае, таксама, як і я яго. Падабаецца, што Гёкхан добры сямейнік, у яго цудоўна атрымліваецца выхоўваць сына, прывіваць пяцігадоваму Гёкдэнізу паводзіны сапраўднага джэнтльмена, павагу да старэйшых. Я вельмі цаню тое, што муж дапамагае мне па доме. Звычайна з ім усё робім разам, іншы раз дапамагае мая мама, калі я, напрыклад, на гастролях. Вось зараз муж з сынам дома, мы чаргуем, так ужо прызвычаіліся рабіць, я прыеду дамоў — Гёкхан паедзе па сваіх справах. А яшчэ ён можа вяртаць мяне з нябёсаў на зямлю, бо я з гарачым тэмпераментам *(усміхаецца)*, умее сказаць, што правільна, а што не. Мне неабходны быў такі чалавек, які гаворыць акуратна, каб не пакрыўдзіць. Хоць ёсць і іншы бок, які мне не вельмі падабаецца, — ён запальчывы, як і я. Спачатку мы нават моцна сварыліся з-за гэтага, а пасля яго матуля мяне навучыла: «Калі ён злы, ты маўчы, а калі астыне, зноў гавары яму, што лічыш неабходным, і ён усё зробіць для цябе». Я навучылася, гэта працуе, і сёння мне здаецца, што мы муж і жонка не сем гадоў, а нашмат болей. Мяне засмучае, калі маладыя кахаюць, жэняцца, а праз год разводзяцца. Ну, не атрымалася — такога не можа быць. Калі вырашылі быць разам, неабходна саступаць.



***— Гюнэш, раскажыце пра сямейныя абавязкі і бюджэт.***

— Кухня, натуральна, на мне, хоць мой муж вельмі добра гатуе, асабліва ў яго атрымліваецца салодкае — усе, хто да нас прыходзіць у госці, просяць ад яго фірменнае цірамісу. Толькі што я злавіла сябе на думцы, што ўсё-ткі Гёкхан больш за мяне выконвае абавязкі па доме. Я гатую, мыю, усё, што датычыцца дзіцяці — гэта я, астатняе — пыласосіць, выносіць смецце, купляе прадукты і ездзіць за рулём — муж.

Наконт сямейнага бюджэту — у нас адразу ўсё ідзе ў агульную скарбонку. У мяне ёсць свае грошы, якія я магу патраціць на сябе, і ў яго ёсць таксама. Аднак мы абмяркоўваем, што павінны купіць, што неабходна для маёй творчасці, вядома, у яго дзейнасці таксама патрэбны немалыя сродкі, каханы шмат мне дапамагае, дзякуй яму.

## АСАБЛІВЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

***— Мацярынства вас неяк змяніла?***

— Змяніла. Я ўвогуле па жыцці вельмі актыўны чалавек, напэўна, няма такога артыста, музыканта, які мяне не ведаў бы асабіста, таму што я люблю з усімі знаёміцца, стасавацца — была паўсюль. А калі стала мамачкай, з'явіліся новыя каштоўнасці — хочацца дамоў, хутчэй да дзіцяці. На свет стала глядзець па-іншаму, часцей прыязджаю ў бацькоўскі дом, напэўна, стала лепш разумець, што такое сям'я, цаніць бацькоў і родных людзей. У мяне цяпер на першым месцы сям'я.

***— Вашага сына завуць Гёкдэніз, хто выбіраў імя?***

— Муж. Гёкдэніз — такое рэдкае імя, значыць «нябеснае мора», я доўга сумнявалася. Аднак, ведаеце, складана пераканаць усходняга мужчыну *(усміхаецца)*. Сыну вельмі падабаецца яго імя, і калі ў садку гавораць, маўляў, такое імя складанае, давай ты будзеш Дзяніска, — сын адказвае — «Не, ніякі я не Дзяніска!» Ён у нас Леў па гараскопе, самастойны. Нядаўна прызнаўся мне, што ў садку дзяўчынку пацалаваў. Актыўна дапамагае нам па доме, любіць мыць посуд, мне здаецца, ён вырасце сапраўдным усходнім мужчынам. Пакуль я не ваджу яго ў гурткі, імкнуся зразумець, чаго ён хоча. Спачатку ён хацеў быць артыстам, як мама, хадзіў на ўсе канцэрты, на рэпетыцыях танчыў разам з балетам. Потым яму надакучыла, і ён стаў хадзіць з татам на трэніроўкі, на некаторы час яго зацікавіў футбол, аднак і да гэтага стаў знікаць інтарэс. Мне здаецца, што ён будзе, як дзядуля, бухгалтарам ці эканамістам, таму што яму падабаецца ўсё падлічваць. Калі ходзім у краму, Гёкдэніз мне тлумачыць, што трэба браць, а што не варта, што лепш купіць па зніжцы, такі гаспадарлівы хлопчык.

***— Якія святы, нагоды абавязкова адзначаюць у вашай сям'і?***

— Мы адзначаем усе святы — беларускія, азербайджанскія, турэцкія. Калісьці абмяркоўвалі ідэю сустрэць Новы год удваіх, а наш хлопчык кажа: «Як удваіх, а я?» І мы вырашылі, што будзем адзначаць гэтае свята толькі ў коле сям'і, за адным вялікім сталом, дзе будуць і мама, і тата, і дзядуля з бабуляй. Мы адпачываем душой, калі ўсе разам.

***— На вашу думку, сям'я — гэта...***

— Сям'я павінна быць на першым месцы ў чалавека, калі чалавек адказвае, што на першым месцы кар'ера, — тады няма сэнсу ствараць сям'ю. Мы, творчыя людзі, такія эмацыянальныя і ўспрымаем усё па-іншаму, не ведаю, што са мной было б, калі б не гэты маленькі сусвет. Таму важна, каб побач знаходзіліся людзі, якія цябе падтрымліваюць. Сям'я — гэта мая дапамога і апора.

***— Дзякуй за гутарку!***

**Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з сямейнага архіва спявачкі.**

### БЛІЦ-АПЫТАНКА

● *Без чаго не ўяўляеце сваю раніцу?*

— Я прачынаюся першая ў сям'і, рана. Не ўяўляю свой ранак, пакуль не падыду да свайго дзіцяці, не пацалую, не абдыму яго, не спытаю, як ён спаў і што бачыў у сне.

● *Любімыя кветкі?*

— Усе ведаюць, што я даўно люблю белыя ружы, і мае прыхільнікі дораць менавіта гэтыя кветкі.

● *Дзе марыце пабываць?*

— З мужам марым убачыць Японію.

● *Салодкае ці салёнае?*

— Салёнае. Абажаю матуліны саленні, калісьці яна зрабіла ну вельмі смачныя салёныя агуркі, і я з'ела амаль увесь слоік *(смяецца)*. Я разумею, што павінна быць усё ў меру, аднак без салёнага не магу!

● *Што для вас каханне мужчыны?*

— Калі мужчына не дазваляе сваёй жанчыне падымаць цяжкія сумкі, у гэтым і праяўляецца яго клопат і каханне.

● *За што вам бывае сорамна?*

— Я ўжо навучылася прасіць прабачэння. Сорамна бывае, калі пакрыўдзіла блізкага чалавека, калі ў нечым не маю рацыі.

● *Што зараз чытаеце?*

— Цяпер чытаю казкі сыну, на якіх вырасла, і згадваю сваё дзяцінства.

● *Любімае месца.*

— Дом майго бацькі ў Баранавічах, там адпачываю душой і вяртаюся ў тыя часы, калі была маленькая.

● *Любімы колер?*

— Любыя адценні чырвонага.

● *Страва?*

— Азербайджанскі плоў, які гатуе мая матуля.

● *Любімыя духі?*

— Яркія, салодкія водары.

● *Самы незабыўны падарунак?*

— Неверагоднае калье з брыльянтамі, якое мне падарылі бацькі мужа ў дзень нашых заручын у 2012 годзе. Гэтым падарункам яны паказалі, што я для іх шмат значу.

● *Сяброўства — гэта...*

— Калі незалежна ад таго, што адбываецца вакол цябе, сябар заўсёды будзе з табой да апошняга.

● *Што б вы змянілі ў сваім жыцці?*

— Нічога. Я наноў бы пражыла тое жыццё, якое ў мяне ёсць!

# ТУТ ЁСЦЬ ШТО ПАГЛЯДЗЕЦЬ УСЁЙ СЯМ'ЁЙ,

## або Падарожжы, якія зачароўваюць



**«Беларусь у маіх вачах» — так назвала Паліна АМЯЛЬЯНЧЫК старонку ў «Інстаграме». І гэта сапраўды погляд закаханай! Выбіраючы аддаленыя ад цэнтра мястэчкі і непапулярныя, малавядомыя турыстам маршруты, дзяўчына адкрывае перад намі нечаканыя цікавыя факты з гісторыі роднага краю. Акрамя фотздымкаў храмаў і руін былых сядзіб, практычна кожны пост Паліны суправаджаецца яркімі біяграфіямі землякоў. Сёння ў гасцях у «СГ» — падарожніца, блогер @palina.belarus і арганізатар тураў па нашай краіне Паліна Амяльянчык.**



— Усё пачалося з падарожжаў... у Еўропу. Мы з мужам ездзілі туды на сваім аўтамабілі, самастойна прадумвалі маршрут, браніравалі гасцініцы паблізу ад прыгожых мясцін і славутасцяў. Асабліва памятным было вясельнае падарожжа ў Італію на 17 дзён. Да гэтага часу ўспамінаем, дзе былі і што бачылі. Потым у нас з'явілася дачка Ксюша, і мы пачалі даследаваць прыгожыя мясціны Беларусі. Але план для нашых падарожжаў па сваёй сутнасці застаўся той жа. Мы склалі спіс з 83 мясцін, якія хацелі б наведаць. Першымі пунктамі на карце былі Косава і Ружаны. Адтуль мы прывезлі не толькі ўражанні, але і фатаграфіі, гісторыі і факты, якімі хацелася падзяліцца. Так з'явілася мая старонка ў «Інстаграме». Я апісвала падарожжа, імкнучыся дадаць у публікацыі як мага больш гістарычных дэталяў і старых фотаздымкаў. Парадавала зваротная рэакцыя: людзі цікавіліся нашымі паездкамі, пыталіся пра маршруты, абмяркоўвалі ў каментарыях гістарычныя факты. Гэта натхняе і далей папулярызаваць беларускія славутасці.

***— Таму вы і вырашылі пачаць арганізоўваць экскурсійныя туры?***

— Так, я ўбачыла цікавасць да нашай краіны. Падпісчыкі часта прасілі ўзяць іх з сабой, але мы падарожнічаем з дзіцем, і гэта было б нязручна. Тым не менш, мне заўсёды хацелася, каб людзі ўбачылі, колькі прыгожых і незвычайных лакацый ёсць у нашай краіне. Я даўно задумвалася аб стварэнні тураў, але з-за пандэміі жаданне трошкі згасла. Аказалася, дарэмна. Без магчымасці выехаць за мяжу людзі сталі яшчэ больш падарожнічаць па Беларусі.

Паездкі для групы я старалася зрабіць максімальна камфортнымі і разнастайнымі. На маю думку, кожнаму цікава пагутарыць з мясцовымі жыхарамі, з падрадчыкам — аб ходзе рэстаўрацыі, а пра храм лепш за ўсё раскажа святар. Я і сёння цёпла ўспамінаю ксяндза Аляксандра з касцёла святога Уладзіслава, што знаходзіцца ў вёсцы Суботнікі Іўеўскага раёна. Ён расказаў пра архітэктуру і прадметы інтэр'ера, правёў нас у крыпту храма і на хоры. Такія моманты бясцэнныя, і менавіта іх я імкнуся ўключыць у падарожжы. Вярнуўшыся з паездкі, людзі будуць поўныя незвычайных уражанняў і новых ведаў.

***— Вы падарожнічаеце з дзіцем — гэта ўскладняе адпачынак?***

— Зусім не, Ксюша прывыкла і ёй усё цікава. Яна любіць гуляць з намі па прысядзібных парках, любавацца руінамі. Вывучаем разам расліны, дрэвы, птушак. Летам ездзілі на станцыю акальцоўвання ў Тураве, а ў верасні на працягу некалькіх выхадных назіралі за жураўлямі. Яркім уражаннем стала знаёмства са статкам зуброў непадалёк ад вёскі Стрыеўка. Калі мы выйшлі з машыны, яны насцярожыліся. Потым цэнтр статка лёг — гэта малыя і мамы. А па перыметры засталіся стаяць дазорныя. Адчуванні былі неверагодныя, гэта такое шанаванне — убачыць паводзіны жывёл у натуральным асяроддзі і паказаць дзіцяці.

***— Сярод вашых маршрутаў шмат не вельмі папулярных. Як выбіраеце, куды адправіцца?***

— Нам цікава даследаваць радавыя шляхецкія маёнткі. На жаль, вялікая частка з іх сёння існуе ў выглядзе руін. Але гэта не адмяняе іх значнасці. Мы любім наведваць храмы, манастыры, замкі, ваенныя аб'екты (крэпасці, бункеры, форты). Новыя славутасці знаходзім у даведніках або нам падказваюць у размовах людзі.

Калі ідзе гаворка пра былыя маёнткі, цікава прасачыць гісторыю іх уладальнікаў: як правіла, яны мелі некалькі сядзібных дамоў. Шпацыруючы па руінах, паглыбляючыся ў мінулае, быццам бы пераносішся ў казку. Фантазія пачынае «дабудоўваць» пакоі, аздабляць іх дэталямі, «паказваць», як тут было раней. Я шукаю вачыма алеі, гляджу на дзвярныя завесы, заглядаюся на плітку. Многія былыя маёнткі пасееў замаляваць Напалеон Орда ў канцы XIX стагоддзя, у перыяд іх росквіту — з паркамі, садамі, сажалкамі і аранжарэямі. У паездках я заўсёды паказваю турыстам яго карціны, замалёўкі іншых мастакоў ці старыя фота сядзіб. Тады вандроўнікі могуць не толькі параўнаць, як усё было і як стала, але і ўявіць шмат дробязяў. Сядзібы — гэта розныя лёсы, якія абуджаюць розум.

Асабліва глыбока мяне ўразіла гісторыя шляхецкага роду Скірмунтаў. Дынастыя прамыслоўцаў, яны шмат зрабілі, каб змяніць наша Палессе. Дзякуючы ім з'явіўся першы ў краіне цукровы завод, яны арганізавалі перапрацоўку бульбы для вытворчасці ачышчанага спірту, пабудавалі паравыя млыны і сыраварны завод, фабрыку стэарынавых свечак і мыла. Але галоўнае — суконную фабрыку, якая працавала на добрым еўрапейскім узроўні, пра што сведчылі дыпломы мануфактурнай выстаўкі ў Маскве, Парыжы і Вене. Я наведала тры іх некалі квітнеючых маёнткі, якія сёння, на жаль, разбураны... Часам сыходжу ў вывучэнне лёсаў з галавой, пішу пасты з ночы да раніцы, а потым не магу заснуць — балюча ад таго, у якім выглядзе сёння знаходзіцца значная частка нашай багатай гісторыі.



***— Якія праблемы чакаюць падарожнікаў па родным краі?***

— Я ўжо казала пра стан многіх славутасцяў. Ёсць праблемы з інфраструктурай і інфармаваннем. Напрыклад, некаторыя мясціны не адзначаны на картах. Як людзям знайсці іх? Ці як даведацца, міма чаго яны зараз праязджаюць? Каля многіх аб'ектаў няма хоць бы невялікага стэнда з інфармацыйнай даведкай.

Прыпаркавацца часта няма куды, не кажучы нават пра прыбіральні і альтанкі для адпачынку. Ды і проста лавачак, каб прысесці і перакусіць, часам няма. Ёсць праблема з прыборкай смецця (таму мы ўжо прывыклі прыязджаць на адпачынак са смеццевымі пакетамі і прыбіраць тэрыторыю).

Было б цудоўна, калі б сядзібныя алеі расчышчалі, каб людзі маглі шпацыраваць па іх. А ўявіце, як ажыла б мясціна, калі б аднавілі сядзібныя водныя сістэмы! Бо гэтыя сажалкі і каналы калісьці радавалі вока.

Убачыўшы тое, што адбываецца, я вырашыла паўдзельнічаць у конкурсе Social Weekend з праектам па выратаванні сядзіб. Мне вельмі хочацца даць другое жыццё маёнткам і мястэчкам, якія прыходзяць у заняпад. Праект стварыў бы новыя рабочыя месцы, у мястэчках і вёсках праз невялікі час з'явілася б інфраструктура, у тураператараў — пашырыўся пералік маршрутаў. Пакуль праект не скончаны, але я ўжо намячаю план дзеянняў.

***— Ці ёсць нейкія станоўчыя зрухі ўжо сёння?***

— Так, у свядомасці людзей. Мяне радуе, што людзі, якія аб'ездзілі Еўропу ўздоўж і ўпоперак, у нейкі момант вырашаюць наведаць штосьці сваё. Я бачу, як вектар нашага мыслення мяняецца. Беларусы, якія лічылі, што ў нас «няма чаго паглядзець», цяпер не толькі ездзяць на экскурсіі па роднай краіне, але і клічуць з сабой знаёмых і сваякоў. Я мару, каб такога было яшчэ больш!

**Віталіна БАНДАРОВІЧ.**
**Фота з архіва Паліны АМЯЛЬЯНЧЫК.**

### КУДЫ МОЖНА ПАЕХАЦЬ ЗІМОЙ?

Сядзіба Кашыцаў у Карэліцкім раёне. Мы прыязджалі туды летам і не маглі адвесці вачэй ад навакольнай прыроды навокал. Узімку яна нагадвае казку. Па дарозе можна заехаць у Даўгінава на ферму смаўжоў.

Мне падабаецца сядзіба Паўлінава ў Баранавіцкім раёне, там можна не толькі пагуляць, але і зладзіць пікнік на прыродзе. Наогул Баранавіцкі раён — гэта сапраўдная жамчужына. Там быццам нехта «рассыпаў» бліскучыя каралі. Паглядзіце на сядзібы. Звярніце ўвагу на архітэктуру, планіроўку і паркі. Калі пранікнуцца гэтым духам, уражанняў хопіць надоўга.

На грамадскім транспарце можна паехаць у Гродна. Лепш на два дні, з начлегам. У мяне ўжо ёсць гатовы маршрут, які магу параіць. Харальная сінагога, лютэранская кірха і вуліца з домікамі польскай архітэктуры пачатку XX стагоддзя... Гэта толькі малая частка таго, што чакае вас у горадзе.

### ТРЫ МАЁНТКІ, ЯКІЯ ВАРТА НАВЕДАЦЬ:

- Сядзіба Плятэраў у Опсе Віцебскай вобласці. Фантастычная мясціна: знаходзіцца на ўзвышшы над возерам, вакол парк, з тэрасы адкрываецца незвычайнай прыгажосці краявід. Ад сядзібы, пабудаванай у неагатычным стылі, да пірса вяла каменная лесвіца з мноствам прыступак. Кажуць, тут гасцявала графіня-рэвалюцыянерка Эмілія Плятэр. Захаваліся жылы флігель, гаспадарчыя пабудовы і стары каменны масток. Знаходзячыся ў гэтым цудоўным кутку, быццам падпадаеш пад яго чары.
- Сядзіба Навіцкіх у Савейках Брэсцкай вобласці. Аднойчы мы рабілі маршрут Грушаўка — Савейкі, і гэта заняло ўвесь дзень. У савецкі час маёнтак Навіцкіх прыводзілі ў парадак. Таму цяпер там ёсць помнік Леніну, скульптуры аленя і зубра ды іншыя цікавінкі, якіх першапачаткова не было. У Савейках добра захавалася пад'язная алея: яна вядзе да разваротнага кальца і прыводзіць да сядзібы. Яшчэ можа ўразіць парк з некалі маляўнічымі алеямі, альтанкамі, арачнымі масткамі і вадаёмамі. Захавалася не толькі сама сядзіба, але і бровар з бутавых камянёў.
- Сядзіба Рэйтанаў у Грушаўцы Брэсцкай вобласці. Чаго вартая адна гісторыя жыцця Тадэвуша Рэйтана! Гэта быў рэдкі чалавек, дэпутат сейма Рэчы Паспалітай. Дамагаючыся пратэсту супраць падзелу Рэчы Паспалітай, Тадэвуш не выпускаў дэпутатаў з залы пасяджэнняў — лёг перад выхадам са словамі: «Забіце мяне, не забівайце Айчыну!» Гэты момант адлюстраваны на карціне Яна Матэйкі «Рэйтан». У Грушаўцы звярніце ўвагу на капліцу каля лесу. Раней у той бок вяла алея з лістоўніц, яна часткова захавалася. Восенню іголачкі іх жоўкнуць, а ствалы застаюцца чорныя. Пейзаж зачароўвае. Цікава, што лістоўніцы становяцца вышэй ад пачатку алеі да капліцы — у гэтым закладзена метафара дарогі ў неба.



# УЗРОСТ — НЕ ПРЫСУД?

## Чаму ў старасці псуецца характар, з'яўляюцца бяссонніца і трывожнасць

**ЗДАЕЦЦА, што ўсё самае галоўнае ў жыцці ўжо было: захапленне, каханне, нараджэнне дзяцей, вучоба, работа, сябры... А цяпер работы няма, дзеці выраслі, сяброў засталося мала, грошай ледзь-ледзь хапае, затое балячак — хоць адбаўляй. Увогуле, нічога добрага. Вельмі часта ў людзей так званага сярэбранага веку развіваецца дэпрэсія. Некаторыя схільныя да з'яўлення дэменцыі. Аб праблемах старэння і тым, як заўважыць і, магчыма, прадухіліць розныя псіхалагічныя захворванні ў пажылых, мы паразмаўлялі з урачом-псіхатэрапеўтам Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Марынай ШЧАСЛЯНОК.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

***— Марына Валер'еўна, што найперш сведчыць аб тым, што чалавек старэе?***

— Прырода так паклапацілася пра чалавека, які старэе, што ў гэтым узросце інтэлектуальныя і эмацыянальныя рэсурсы выкарыстоўваюцца вельмі эканомна, зберагаючы магчымасці памяці і розуму для найбольш значных і істотных тэм і прадметаў. Гарманічнае псіхічнае старэнне ў аптымальным варыянце прадугледжвае пазіцыю спакойна-мудрага сузірання, разумнага прымірэння з наступаючымі зменамі і перспектывай завяршэння жыцця.

Запаволенне псіхічных працэсаў з'яўляецца нармальнай прыкметай старэння. Лёгкая затармажанасць рэакцый суправаджаецца як бы пагаршэннем кемлівасці, запаволеннем маўлення, аднак змест выказванняў можа сведчыць аб глыбокім аналізе і вялікім жыццёвым вопыце. У гэты перыяд пагаршаецца здольнасць запамінаць нешта новае. Запаволенасць псіхічных рэакцый бывае таксама звязана і з пагаршэннем слыху і зроку, што, натуральна, уплывае на ўвагу і здольнасць успрымання ў пажылых людзей.

Старадаўняя французская прыказка — «Кожны старэе так, як ён жыў» — вызначае толькі адну з тэндэнцый, уласцівых пажылому і старэчаму ўзросту. Яна не адлюстроўвае іншых заканамернасцяў гэтага ўзроставага перыяду. У рэальнасці старасці ўласцівыя многія якасці, якія аб'ядноўваюць дагэтуль непадобных людзей. Сюды адносяцца і некаторая эгацэнтрычнасць, і марудлівасць у прыняцці рашэнняў, і адмысловы недавер.

***— Можна ўвогуле адзначыць, што ў пажылога чалавека часта мяняецца, калі не сказаць псуецца, характар...***

— Так. Старому чалавеку цяжка мяняць сваё меркаванне. Нягнуткасць у сваіх поглядах — гэта так званы кансерватызм старэйшага пакалення. Гэта звычайна праяўляецца ва ўзважаных разважаннях і непрадузятай ацэнцы з'яў, але часам прымае выгляд упартасці і нязгоды.

Пажылым людзям уласціва ўсё большая засяроджанасць на сабе, перш за ўсё, на сваім здароўі. Адначасова можа мяняцца і эмацыянальная цікавасць, больш вузкімі і фармальнымі становяцца кантакты. Пажылым людзям часта ўласцівыя крыўдлівасць, незадаволенасць, недаверлівасць.

> **«Калі страхі і трывогі запаўняюць усе думкі, вызначаюць змест жыцця і накіраванасць дзеянняў, падпарадкоўваюць сабе ўсё існаванне чалавека, а нярэдка і яго навакольных, то гаворка ідзе ўжо пра расстройства».**

Магчыма ўзмацненне тых рыс характару, якія з'яўляліся індывідуальнымі адрозненнямі чалавека на працягу жыцця. У іншым варыянце, наадварот, адбываецца згладжванне ранейшых рыс характару. У найбольш спрыяльным выпадку чалавек становіцца больш ураўнаважаным і памяркоўным. У крайніх сітуацыях змены асабовых рыс вельмі выражаныя, за кошт чаго нарастае падабенства ў людзей, якія дажываюць да глыбокай старасці.

> **«Кагосьці больш хвалююць фізіялагічныя прыкметы старэння, для іншых найбольш адчувальным момантам з'яўляецца спыненне прафесійнай дзейнасці, выхад на пенсію. Для большасці людзей вельмі значным аказваецца пагаршэнне фінансавага становішча».**

***— Усе мы ведаем , што «старасць — не радасць». Гэта і праблемы са здароўем, і выхад на пенсію, і абмежаванасць кантактаў... Што з'яўляецца найбольшым стрэсам у пажылым узросце?***

— Пажылыя людзі па-рознаму рэагуюць на перамены ў сваім сацыяльным становішчы, якія непазбежна спадарожнічаюць старэнню. Прычым, гэта заклапочанасць нярэдка ўзнікае яшчэ да наступлення позняга ўзросту. Кагосьці больш хвалююць фізіялагічныя прыкметы старэння, для іншых найбольш адчувальным момантам з'яўляецца спыненне прафесійнай дзейнасці, выхад на пенсію. Для большасці людзей вельмі значным аказваецца пагаршэнне фінансавага становішча.

***— Ад людзей сярэдняга ўзросту нярэдка даводзіцца чуць: хутчэй бы на пенсію! Чаму ж на яе нярэдка дрэнна рэагуюць, пастарэўшы?***

— Уявіце, што чалавек усё сваё жыццё працаваў, ды яшчэ, магчыма, што і на адным месцы на працягу не аднаго дзесяцігоддзя. І вось знешнія ўмовы памяняліся — ён сышоў на пенсію. Але працягвае па-ранейшаму жыць тымі мінулымі гадамі, якія ён праводзіў, па сутнасці, на адным месцы. І прыстасавацца да новых умоў ужо вельмі складана ці наогул немагчыма. Папросту кажучы, чалавек выходзіць з аднаго рэжыму свайго жыцця, а ў іншы так і не можа ўвайсці. Магчыма, ён проста не ведае ці не ўмее пабудаваць сваё новае жыццё ў новых абставінах.

Але ж можна яго арганізаваць і пражыць так, каб у новых знешніх умовах ужо не біцца аб ранейшыя пытанні: што далей? Як быць? Як жыць? Што трэба, каб зрабіць гэта «з чыстага ліста»? Найперш, напэўна, хоць бы адзін раз у жыцці паспрабаваць адказаць на пералічаныя пытанні самому сабе.

***— Ці могуць псіхічныя расстройствы ўзнікаць у познім узросце, калі да гэтага чалавек усё жыццё не меў падобных праблем?***

— Могуць. Гэтыя парушэнні ў адных выпадках суправаджаюць пагаршэнне фізічнага здароўя, у іншых з'яўляюцца вынікам стрэсавых уздзеянняў і перажыванняў. Трывожнасць, плаксівасць, бяссонніца, пастаяннае чаканне чагосьці дрэннага — найбольш частыя праявы гэтых расстройстваў. Яны сапраўды могуць быць цяжкімі, пакутлівымі, пагаршаюць якасць жыцця, але звычайна не нясуць пагрозу памяці і розуму, чаго так баяцца пажылыя людзі.

Своечасовае выяўленне гэтых расстройстваў і лячэнне аблягчае стан. Пры гэтым, як правіла, няма неабходнасці змяшчаць пажылога чалавека ў бальніцу.

***— Як вызначыць, што ў блізкага пачынаюцца гэтыя праблемы?***

— Пэўным арыенцірам, натуральна, служаць скаргі на змяненне самаадчування або нязвыклы стан. Аднак трэба мець на ўвазе, што людзі ў сталым узросце шукаюць у першую чаргу псіхалагічныя тлумачэнні гэтых з'яў, звязваюць іх з нягодамі пражытага жыцця або нейкімі нядаўнімі сумнымі падзеямі. Часта праходзіць доўгі час, перш чым пацыенты прыйдуць са скаргамі да ўрача ці пакуль праявяць занепакоенасць блізкія пажылых людзей.

***— Спадарожнікам людзей сталага веку часта становіцца бяссонніца...***

— Сапраўды, парушэнне сну — адна з найбольш частых скаргаў пажылых людзей. Многія лічаць, што гэта ледзь не абавязковы спадарожнік старэння. У познім узросце можа адбывацца скарачэнне працягласці начнога сну з больш раннім ранішнім прабуджэннем, аднак гэта, як правіла, не выклікае скаргаў. Да лекара звычайна звяртаюцца з цяжкасцямі ў засынанні або адсутнасцю сну, павярхоўным сном з яркімі снамі, частымі абуджэннямі сярод ночы, адчуваннем неспакою, трывогі, немагчымасцю зноў заснуць, цяжкім станам разбітасці раніцай, адсутнасцю пачуцця адпачынку. Многія пачынаюць самастойна прымаць сродкі для паляпшэння сну.

Між тым прычын, якія выклікаюць парушэнні сну, досыць шмат, яны разнастайныя і не заўсёды звязаныя з псіхічнай няўстойлівасцю. Парушэнні сну часта абумоўлены пагаршэннем фізічнага здароўя, такімі захворваннямі, як гіпертанічная хвароба, сардэчная недастатковасць, цукровы дыябет, адэнома прастаты. Зразумела, што ў гэтых выпадках наладжванню сну спрыяе лячэнне асноўнага захворвання, а не прыём снатворных прэпаратаў.

> **«Парушэнні сну часта абумоўлены пагаршэннем фізічнага здароўя, такімі захворваннямі, як гіпертанічная хвароба, сардэчная недастатковасць, цукровы дыябет, адэнома прастаты. Зразумела, што ў гэтых выпадках наладжванню сну спрыяе лячэнне асноўнага захворвання, а не прыём снатворных прэпаратаў».**

Мала хто ведае, што шэраг прэпаратаў для лячэння некаторых хвароб пагаршаюць якасць сну. У такіх выпадках змена рэжыму прыёму лекаў ліквідуе праблемы са сном. Раптоўныя абуджэнні характэрныя таксама пры так званых начных спыненнях дыхання (апноэ) або парушэннях рытму дыхання, калі чалавек храпе ў сне. У норме пры саматычных захворваннях у пажылых людзей парушана працягласць сну, з прычыны гэтага здараюцца частыя абуджэнні. Калі ж незадаволенасць сном пажылога чалавека ўключае ў сябе і цяжкасці засынання, і раннія абуджэнні, і адчуванне адсутнасці сну, то ў аснове гэтых парушэнняў можа быць псіхічнае расстройства.

> **«Пажылым людзям уласціва ўсё большая засяроджанасць на сабе, перш за ўсё, на сваім здароўі. Адначасова можа мяняцца і эмацыянальная цікавасць, больш вузкімі і фармальнымі становяцца кантакты. Пажылым людзям часта ўласцівыя крыўдлівасць, незадаволенасць, недаверлівасць».**

***— На што яшчэ часта скардзяцца пажылыя людзі?***

— Расстройствы настрою і трывожнасць нярэдка спадарожнічаюць праявам псіхалагічнага дыскамфорту ў перыяд старэння. Скардзячыся на дрэннае самаадчуванне, чалавек адзначае пачуццё ўнутранай трывогі, напружанасці, невытлумачальнага хвалявання ў грудзях, «дрыжання», «трапятання», немагчымасці расслабіцца. У іншых выпадках перажыванні і трывогі напоўнены боязззю за здароўе — сваё або блізкіх, найбліжэйшую і аддаленую будучыню — сваю і сям'і. Гэта могуць быць уяўленне катастрофы са сваім здароўем, страх інфаркту, інсульту, боязь стаць абузай для навакольных або страх перад адзінотай і немагчымасцю атрымаць неабходную дапамогу.

Калі страхі і трывогі запаўняюць усе думкі, вызначаюць змест жыцця і накіраванасць дзеянняў, падпарадкоўваюць сабе ўсё існаванне чалавека, а нярэдка і яго навакольных, то гаворка ідзе ўжо пра расстройства. Гэты стан не сведчыць пра глыбокія паражэнні псіхікі, і доўгі час уяўляецца псіхалагічна зразумелым. Але тут патрэбная своечасовая медыкаментозная і псіхатэрапеўтычная дапамога.

***— А як яшчэ можна палепшыць псіхічны стан пажылога чалавека?***

— Ёсць некалькі эфектыўных спосабаў. Найперш гэта фізічныя практыкаванні, якія прыносяць як фізічную, так і псіхалагічную карысць, уключаючы задаволенасць жыццём, добры настрой і псіхічную гармонію, змякчэнне праяў псіхалагічнага дыстрэсу і сімптомаў дэпрэсіі, зніжэнне крывянага ціску, паляпшэнне работы сэрца.

Паляпшае стан і сяброўскае стаўленне. Пажылыя людзі маюць патрэбу ў заахвочванні сваіх дзеянняў. Пажадана часцей пацвярджаць іх правільнасць і заахвочваць поспехі. «Вы сёння больш упэўнена рухаецеся з кіем!», «Як добра вы сёння селі на ложку!», «Вам гэтая кофта вельмі да твару!» Вельмі дабратворна дзейнічае распытванне пажылых людзей пра іх мінулае. Папрасіце пажылога чалавека расказаць аб яго сваяках, дзяцінстве, месцах, дзе ён жыў у маладосці, пра ранейшую работу, інтарэсы. Вельмі добра разам разглядаць старыя фатаграфіі мясцін, дзе ён нарадзіўся, жыў, працаваў, асабліва тыя, на якіх ён сфатаграфаваны ў росквіце сіл ці пры выкананні сацыяльна значнай работы.

Гэта заўсёды спрыяе павышэнню самапавагі пажылога чалавека. Аднак сталыя людзі павінны адчуваць вашу сапраўдную зацікаўленасць у падзеях, пра якія яны распавядаюць, ваша жаданне перажыць тое, што калісьці яны перажылі і адчулі. Калі пажылы чалавек не паверыць вашай зацікаўленасці, то, хутчэй за ўсё, замкнецца ў сабе, і вы надоўга страціце яго давер.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «МВЗ ПромСервис», 220033, Минск, пр-т Партизанский, 8, корп. 12, пом. 55 |

**Предмет аукциона: транспорт, спецтехника, оборудование, бывшие в употреблении.**
**Адрес: г. Минск, пр-т. Партизанский, д. 8, корп. 12**

| № лота | Наименование, модель, инв. № | Инв. № | Начальная цена (без НДС), бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Машина листогибочная трехвалковая | 426498 | 5740,00 | 287,00 |
| | Ресивер РВ 500.11.00 | 55710463 | | |
| 2 | Машина обрабатывающая ИВ-2143П | 426476 | 9030,00 | 451,50 |
| | Пила дисковая по металлу 315х2,5х32 мм (3 шт.) | 2771864 | | |
| | Ховеркарт | 5588983 | | |
| | Каркас (2 шт.) | 5588733 | | |
| 3 | Станок ленточнопильный ARG220 | 440902 | 3732,75 | 186,64 |
| | Переходник пластиковый для труб (9 шт.) | 5588955 | | |
| | Ручка из неопрена (8 шт.) | 5588954 | | |
| | Ручка резиновая (8 шт.) | 5588953 | | |
| | Сиденье-спинка | 5588952 | | |
| | Соединитель Т-образный пластиковый (30 шт.) | 5588956 | | |
| | Рольганг подающий М280 3000 мм | 417015 | | |
| 4 | Установка воздушно-плазменной резки БМТ 1530ПР | 888938 | 18 020,73 | 901,04 |
| | Защитный экран 5-421-019 (2 шт.) | 5588541 | | |
| | Защитный экран 5-422-020 (5 шт.) | 005588645 | | |
| | Мундштук внутренний к РМЗ (5 шт.) | 5588705 | | |
| | Сопло 5-409-008 65А (12 шт.) | 5588482 | | |
| | Сопло 5-409-009 85А (13 шт.) | 5588540 | | |
| | Сопло ЕХ-5-410-010 (13 шт.) | 5588598 | | |
| | Тубус ЕХ-5-306-010 | 5588734 | | |
| | Электрод 45/65/85а (12 шт.) | 5588481 | | |
| | Электрод ЕХ-5-401-002 (13 шт.) | 5588597 | | |
| | Крючок для теплиц (23 шт.) | 5588244 | | |
| | Электросчетчик | 470631 | | |
| 5 | Установка экструзионная ММВЗ Н-06-86-000-00 | 434124 | 5180,00 | 259,00 |
| | Установка охлаждения оболочки троса | 434123 | | |
| | Установка подачи троса | 434122 | | |

**Порядок ознакомления:** осуществляется по предварительному согласованию, Жогло Юрий Александрович, тел. +375 (44) 778-67-68, пн. – пт. с 8.00 до 17.00

Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа — ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» (далее – Закон).**

Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 04.02.2021 заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 Закона.

Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

Порядок оформления результатов торгов: победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** со дня проведения торгов |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **3 (трех) процентов** от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в ЕГРСоБ 23.11.2020, в газете «Звязда» 21.11.2020

**Дата, время и место проведения аукциона: 08.02.2021** в 14.00, г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка».

Для участия в аукционе необходимо подать организатору торгов заявление с приложением всех необходимых документов, а также перечислить задаток в срок с 9.00 **21.01.2021** до 17.00 **04.02.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Контактные данные: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: info@ipmtorgi.by**

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91» (Продавец)**

**Лот №1:** 1. Административные встроенно-пристроенные помещения с инв. № 500/D-1004524. Площадь — 485 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Судмалиса, 22- 2Н. **Обременения:** аренда. **Начальная цена с НДС** – 564 643,50 руб. **Задаток** - 28 232,18 руб. **Штраф** – 10 000,00 руб.

Аукцион состоится **25.02.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. **Шаг аукциона** – 1%.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **23.02.2021 в 11.00**.

☎ Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

---

Утерянную идентификационную пластиковую карточку АВ0020215 от 02.10.2020 г. Общества с ограниченной ответственностью «ЭРА-Недвижимости плюс» на имя риэлтера Жуковского Сергея Вячеславовича **считать недействительной.**

УНП 193169067

---

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 18 февраля 2021 года на 3-м открытом аукционе проводит 1-й от 14 января 2021 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 7 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5536 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 10Е9003017, дв. 9000898, 1990 г., *4 кат., 5465 км,* электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № ЮП7904ТДПО, 1990 г. | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 80 000,00 | 16 000,00 |
| 8 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5335 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 10Е8904018, дв. 8911330, 1989 г., *4 кат., 4564 км,* электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № ЮС7904ДРСД, 1989 г., *4 кат.* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 80 000,00 | 16 000,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **18 февраля 2021 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 15 февраля 2021 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **18 февраля 2021 г. с 9.00 до 10.00.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона**.**

Да 29 снежня паказчык дасягнуў 501, і было відавочна, што ўведзеныя абмежаванні не даюць патрэбнага выніку. Урад ізноў змяніў тактыку: за два дні да Новага года палітыкі абвясцілі аб увядзенні каменданцкай гадзіны падчас свят і па выхадных днях. Пасля 22.00 належала знаходзіцца ў сябе дома, знаходжанне на вуліцы або ў гасцях — забаронена. Да аховы парадку былі прыцягнутыя пагранічнікі і народнае апалчэнне.

«Гэта значыць, 31 снежня ўрад прапануе прыходзіць у госці да 22.00 і заставацца да пятай раніцы? Лічыцца, што так будзе абмежавана распаўсюджванне віруса?» — напісаў у «Твітэры» экс-міністр адукацыі Вячаслаў Дамбroўскі. На Новы год паліцыі ўдалося аформіць 1136 адміністрацыйных пратаколаў. «Уладальнікі дамоў, дзе праходзілі вечарынкі, спускалі сабак. У службовыя аўтамабілі ляцелі прадметы. Былі здзейсненыя напады [на вартавых парадку]», — распавяла на пасяджэнні парламенцкай камісіі сакратар МУС Сігне Балодэ.




### ДЗЕ ЛОГІКА?

Тым часам урад вызначыўся са спісам забароненых тавараў. Напярэдадні Новага года ў краме можна было купіць ёлку, але нельга было купіць ёлачныя цацкі. Можна было купіць пральны парашок, але не шкарпэткі. Можна было купіць прадукты, але не патэльню.

Гандаль у інтэрнэце не быў абмежаваны, таму шкарпэткі і ёлачныя цацкі можна было замовіць анлайн. Сістэма дастаўкі апынулася перагружаная, любую бытавую дробязь трэба было чакаць у сярэднім тыдзень. У многіх магазінаў з'явілася опцыя замовіць анлайн і забраць на касе.

Некаторыя крамы пайшлі далей: забароненыя тавары можна было замовіць проста ў краме. Логіка ў наступным: калі можна прадаць тавар праз інтэрнэт, то можна і па тэлефоне, а калі ўрад не сказаў выразна, за колькі гадзін да куплі яго трэба замовіць, значыць, зрабіць заказ можна хоць за некалькі хвілін да пакупкі.

Алгарытм работы гаспадарчай крамы наступны: пытаецеся на касе, якім чынам можна набыць «забаронены» крэм для абутку, вам тлумачаць, што яго можна замовіць па тэлефоне, і выдаюць нумар тэлефона. Тэлефанаваць з крамы нельга, трэба выйсці. Выходзіце, тэлефануеце ў тую ж краму, тлумачыце, што хочаце купіць, другі раз (!) ідзяце на касу, называеце сваё імя, аплачваеце і забіраеце тавар.

Кнігарня паступае прасцей. Падыходзіце да касы, пытаецеся, як купіць кнігу. Касір тлумачыць: на месцы купіць нельга, трэба зрабіць заказ. Калі не ведаеце, што хочаце, можна прайсці па краме і выбраць, гартаць кнігі таксама можна. У краме тлумачаць: нельга браць кнігу ў рукі і несці на касу. Замест гэтага трэба паклікаць прадаўца, пазначыць патрэбную кнігу і назваць сваё імя. Прадавец сам бярэ кнігу і адносіць яе на касу. Потым на касу ідзе пакупнік, аплачвае тавар і забірае яго.

Магазін касметыкі прапануе купляць крэмы праз месенджар. Прыходзіце ў краму, просіце крэм, вам прыносяць тавар і кажуць, што купіць яго адразу нельга, трэба замовіць. Для гэтага вы фатаграфуеце тавар і яго штрых-код, затым адпраўляеце паведамленне. Крама адказвае ў месенджары: праз шэсць хвілін тавар можна забраць на касе. Падыходзіце, аплачваеце, забіраеце заказ.

Гэтыя абмежаванні таксама не далі патрэбнага выніку: на 5 студзеня двухтыднёвы кумулятыўны паказчык захворвання на 100 тысяч чалавек дасягнуў 581. Прэм'ер-міністр Крыш'яніс Карыньш адпраўляе ў адстаўку міністра аховы здароўя Ілзэ Вінкеле. Фармальная прычына — план вакцынацыі рыхтуецца занадта павольна, урад атрымаў яго толькі 5 студзеня, заўважыла Бі-бі-сі.

Прэм'ер і кіраўнік Міністэрства аховы здароўя праводзяць дзве паралельныя анлайн-прэс-канферэнцыі: Карыньш аб'яўляе аб адстаўцы Вінкеле, Вінкеле прэзентуе план вакцынацыі. На той жа прэс-канферэнцыі Карыньш заяўляе, што абавязкі кіраўніка Міністэрства аховы здароўя часова будзе выконваць... кіраўнік Мінабароны Арціс Пабрыкс.

«Сёння я здзіўлены ўдвая. Спачатку праз дэмісію (адстаўку) міністра аховы здароўя Ілзэ Вінкеле, потым — праз маё нібыта прызначэнне выконваючым абавязкі кіраўніка Міністэрства аховы здароўя. Лічу, што ва ўмовах крызісу, звязанага з распаўсюджваннем COVID-19, гэтыя абавязкі павінен узяць на сябе кіраўнік урада», — напісаў Пабрыкс у «Твітэры».

«Катастрафічная камунікацыя. Нават поўныя ідыёты, перад тым як скінуць міністра, ну хоць бы ў які-небудзь парламенцкім буфеце дамаўляліся з наступным, — заявіў латвійскі рэкламшчык Эрык Стэндзеніекс. — Ну, і эпічная адсутнасць якой-небудзь павагі да лідара». Міністэрства аховы здароўя Латвіі ўзначаліў экс-міністр эканомікі Даніэль Паўлютс.

### НЕБЯСПЕЧНЫ ШТАМ

Сітуацыя ў латвійскіх медустановах стабілізавалася, ёсць магчымасць шпіталізаваць усіх пацыентаў з COVID-19, якіх неабходна лячыць у стацыянары, заявіла кіраўнік Службы неадкладнай медыцынскай дапамогі (СНМД) Ліене Цыпуле. Аднак тут ёсць адзін важкі нюанс. Як заўважаюць спецыялісты, не выключана, што распаўсюджванне каранавіруса ў Латвіі не запаволіцца, а паскорыцца ў сувязі са з'яўленнем новага, больш небяспечнага штама, які ўпершыню быў выяўлены ў Вялікабрытаніі, а цяпер знойдзены і ў Латвіі. Прагнозы на выпадак распаўсюджвання гэтага штама сумныя, піша Neatkariga.

Па даных СНМД, доля занятых ложкаў, прадугледжаных для хворых з каранавірусам, вагаецца ад 79 да 83 працэнтаў. Ёсць бальніцы, дзе занятыя ўсе такія месцы. У цэлым у Латвіі прадугледжана 1132 ложкі для пацыентаў з COVID-19, тэарэтычна можна перапрафіляваць яшчэ 82. З пачатку гэтага года колькасць пацыентаў з каранавірусам у шпіталях не апускалася ніжэй за адзнаку ў тысячу. Калі новы штам ковіда будзе распаўсюджвацца так, як у Вялікабрытаніі, колькасць шпіталізаваных ужо да лютага можа дасягнуць 1369, а да канца наступнага месяца — ужо 5099! У гэтым разе наступствы будуць проста катастрафічныя.

Актуальныя эпідэміялагічныя даныя паказваюць, што каранавірус «б'е» і па дзецях, хоць за школьныя парты яны так і не вярнуліся, паведаміў Цэнтр прафілактыкі і кантролю захворванняў (SPKC). У часткі малых узнікае спецыфічны сіндром — мультысістэмнае запаленне.

За апошнія два месяцы колькасць інфіцыраваных COVID-19 у латвійскіх цэнтрах сацыяльнага догляду вырасла да чатырох тысяч. Такая інфармацыя была агучана ў праграме de facto на LTV. Амбудсмен Юрыс Янсанс заявіў, што з-за недзеяздольнасці Міністэрства дабрабыту і самакіраванняў жыцці людзей, якія пражываюць у цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання, падвяргаюцца небяспецы. У кастрычніку толькі 1,6 працэнта ўсіх зарэгістраваных выпадкаў COVID-19 былі звязаны з цэнтрамі сацыяльнай апекі. У лістападзе гэты паказчык дасягнуў 7,4 %, а ў мінулым месяцы — ужо 13,4 %.

Чаму так адбываецца? Эксперты звязваюць такую сітуацыю з некампетэнтнасцю ўлады. Латвійскай дзяржавай кіруюць людзі, абсалютна адарваныя ад рэальнага жыцця, мяркуе незалежны эканаміст Яўгенія Зайцава. «Цяперашні ўрад [Крыш'яніса] Карыньша, міністр фінансаў, які ў нас ёсць, — яны не разумеюць ні тое, што разгортваецца рэальны крызіс, або, можа быць, чуюць словы, што крызіс ёсць, але не разумеюць яго глыбіні і наступстваў. І, адпаведна, не ведаюць, што рабіць. Усё, што яны ўмеюць рабіць, — вырашаць свае праблемы для таго, каб пакрыць выдаткі дзяржавы, у першую чаргу, выдаткі дзяржавы на ўтрыманне дзяржапарату», — заўважыла Baltnews эксперт.

**Пётр ДУНЬКО.**

# ШЛЯХІ ЛЕАНІДА ЛЯВОНАВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Работы ў пасляваенны час было многа. Стараннага, ініцыятыўнага хлопца заўважаюць. Аднойчы яго выклікалі ў Брэст і прапанавалі паехаць на вучобу ў Ціміразеўскую сельгасакадэмію ў Маскве. Леанід з радасцю згаджаецца. Атрымаць грунтоўную адукацыю ў найлепшай ВНУ сельскагаспадарчага профілю ў сталіцы СССР выглядала падарункам нябёсаў для простага сельскага хлопца. Ён хуценька сабраў усе неабходныя дакументы, напісаў бацькам. З Брэста ў Маларыту ехаў нібы на свята... Але там яго хутка апусцілі з неба на зямлю. Тагачаснаму сакратару Маларыцкага райкама партыі Уладзіміру Каваленку патрэбныя былі кадры на месцы, а не вучоныя з маскоўскімі дыпламамі. Ён папрасіў паглядзець накіраванне... і на вачах юнака парваў гэтую паперу на дробныя кавалкі. Сказаў толькі: «Паедзеш у калгас, у Хаціслаў, старшынёй». Так з сабраным у Маскву чамаданам 23-гадовы аграном і камсамольскі работнік рушыў у незнаёмую вёску. Дарогі туды фактычна не было, ехаць даводзілася сцяжынамі паміж лясоў і балот. Падводай трэба было дабірацца не адну гадзіну, а пехатой у разводдзе людзі трацілі ледзь не паўдня. (Цяпер ад Маларыты да Хаціслава шлях на машыне займае 10—12 хвілін. — **Аўт.**)

Сход па яго абранні праходзіў цяжка. Калгаснікі з недаверам аднесліся да кандыдатуры прэтэндэнта на старшыню. «Хлапчыска, што ён зробіць, жыцця не бачыў?!» — выкрыквалі проста з месцаў удзельнікі таго сходу. Нямала сіл, энергіі, красамоўства спатрэбілася ўпаўнаважаным з раёна, каб угаварыць калгаснікаў прагаласаваць за новага старшыню. Не з першага разу, але сяктак прагаласавалі. Упаўнаважаныя з'ехалі, а ён застаўся ў калгасе з гучнай назвай «Запаветы Леніна». Тое, што атрымаў Леанід Лявонаў, калгасам па-сутнасці назваць было нельга. Мелася некалькі вёсак з насельніцтвам. У абсалютнай большасці людзі жылі вельмі бедна. Бо землі бедныя, навокал пяскі і балота. Напачатку аб'яднання ў калектыўнай гаспадарцы налічвалася ўсяго 20 кароў. Вытворчых памяшканняў, накшталт фермы або канюшні не было і заваду. У навакольных лясах яшчэ снаўдаліся бандыты. І ў такіх умовах трэба было распачынаць работу, сеяць хлеб, атрымліваць малако і мяса.

## Людзі на балоце

— Колькі сябе памятаю, усё гаварыў людзям пра светлую будучыню, запэўніваў, што ўсё ў нас атрымаецца — успамінае Леанід Іванавіч. — І людзі паверылі.

Яму, відаць, дапамагала, што пэўны вопыт работы ўсё ж меў. І ў райвыканкаме даводзілася наведваць гаспадаркі, якія крыху ўздымаліся на ногі, і на радзіме, на Смаленшчыне, бачыў па тым часе паспяховыя спробы калектыўнай гаспадаркі. І ўсё ж сённяшняму чалавеку, маладым кіраўнікам, думаю, складана ўявіць, з чаго можна пачынаць работу, калі няма ніводнай машыны, ніводнага трактара, ніводнага прыстойнага памяшкання для жывёлы. А за работу людзям трэба налічваць не рэальныя грошы, а працадні — палачкі ў табель.

Агледзеўшы калгас, малады старшыня зразумеў, што трэба нейкім чынам стварыць рэальную базу для кармлення жывёлы. «Кругом жа балоты ды пяскі. Калі падымаўся вецер, пясчаныя буры былі такія, што людзі не ведалі, куды хавацца, толькі пясок на зубах рыпеў — згадаў былы старшыня. — Таму для пачатку рашылі сваімі сіламі правесці меліярацыю на балоце. Адмералі кавалак прыкладна гектараў у сто і абкапалі рыдлёўкамі ўручную балота: праклалі раўкі і зрабілі адвод вады ў канал. Сёння тую работу няма з чым і параўнаць па цяжкасці, стаялі дзе па калена, а дзе і па пояс у вадзе», — успамінаў Леанід Лявонаў. Але ж здолелі, абкапалі. Ён працаваў нароўні з усімі, паказваў прыклад.

Такім чынам атрымалі першае кармавое ўгоддзе, праўда, не лепшай якасці. Спачатку на балоце расла далёка не канюшына. Некалькі разоў давялося скасіць, акультурыць сенакос, каб потым збіраць значна лепшую траву для сена. Думаю, не трэба казаць, што касілі ўручную, касой, аралі, сеялі з дапамогай коней.

Вырашыў пытанне малады старшыня неўзабаве і з пясчанымі бурамі. Паслухаў старажылаў, параіўся з калегамі і прыняў рашэнне садзіць лес. На тых пясках, вядома, нічога не расло б іншага. А лес разросся. Тады нават стварыў калгаснае лясніцтва, набраў спецыяльную брыгаду людзей, якія займаліся лесапасадкай. Пазней тое лясніцтва перайшло пад эгіду лясгаса, яно і сёння ёсць у Хаціславе. «А цяпер еду часам, пагляджу на той лес, душа радуецца» — заўважае Леанід Іванавіч.

## Тэхніка, кадры, дарогі

Калі першы трактар у гаспадарцы з'явіўся, зараз ён дакладна і не ўспомніць. Недзе гадоў праз пяць пасля яго заступлення на пасаду старшыні. І гэта быў тэхнічны прарыў. Тады ўсё разам пачало ажываць, развівацца: з'явілася тэхніка, пачалі ўзводзіць вытворчыя памяшканні. Узвялі фермы, вырасла пагалоўе жывёлы, пайшлі ўгору і надоі, і ўраджаі. Калгаснікі пачалі атрымліваць за работу грошы. А калі ў працаўнікоў вёскі з'явіліся пашпарты, яны не былі прывязаныя да месца жыхарства, як раней, многія пацягнуліся ў горад. Чыгунка праходзіць побач, дабірацца нават у Брэст для многіх стала спакусай. Тады старшыня заняўся вырашэннем кадравай праблемы. Паехаў у вёскі суседняй Украіны, пагаварыў з моладдзю. Украінскія вёскі тады былі густанаселены, у сем'ях традыцыйна было шмат дзяцей. Угаварыў дзяўчат прыехаць на работу, абяцаў пражыванне ў інтэрнаце і заробкі. Для гэтага тэрмінова вызвалілі адзіны адміністрацыйны будынак, які служыў канторай. Пераабсталявалі пад жылыя пакоі і пасялілі там 40 дзяўчат. Менавіта столькі прыехала на першы заклік Лявонава. Маладыя ўкраінкі сталі даяркамі, свінаркамі, цялятніцамі. Абсалютная большасць з іх павыходзілі замуж за мясцовых хлопцаў. Потым ужо гаспадарка дапамагала маладым сем'ям узводзіць уласнае жыллё.

Згадаў Леанід Лявонаў, як упершыню да яго ў гаспадарку прыехаў Пётр Машэраў, на той час першы сакратар Брэсцкага абкама КПБ. Летам па лясных дарогах дабраўся неяк да Хаціслава машынай. Сказаў, што хоча паглядзець калгас, даехалі з ім толькі да Мельнікаў, далей машына не прайшла. Пётр Міронавіч пераабуўся ў боты, пахадзілі з ім па палетках. Тады ён паабяцаў прыехаць яшчэ раз. І слова сваё стрымаў, праз колькі гадоў прыехаў ужо па дарозе, якую калгас праклаў гаспадарчым спосабам. Пазней, праз многа гадоў тую дарогу пакрыюць асфальтам. А тады пракласці надзейную гравійку стала своеасаблівым прарывам. Бо дарога азначала іншы ўзровень жыцця.



Машэраў прыязджаў у гаспадарку і пазней ужо на пасадзе першага сакратара кампартыі рэспублікі, у той час, калі калгас «Запаветы Леніна» станавіўся вядомым, выходзіў па многіх паказчыках на лідарскія пазіцыі.

Калі вытворчасць стала прыносіць прыбытак, у Хаціславе пачалі шмат будаваць. У калгасе вахтавым метадам адзін час працавала шэсць будаўнічых брыгад з Украіны, многа ўзводзілі гаспадарчым спосабам. Выраслі цэлыя вуліцы з добраўпарадкаваных катэджаў і двух-трохпавярховых дамоў. У вёсцы пракладваецца водаправод і іншыя камунікацыі, асфальтуюцца дарогі, узводзяцца школа, дзіцячы садок, амбулаторыя. Дом культуры па тым часе быў адным з найлепшых у вобласці. Першым у раёне Хаціслаў перажывае газіфікацыю. Гэта ўжо дзякуючы таму, што Леанід Лявонаў быў абраны ў Вярхоўны Савет БССР. За цяпло ў дамах жыхары вёскі і зараз добрым словам згадваюць былога старшыню.

## Добразычлівы кіраўнік

Да канца 1960-х у калгасе атрымлівалі па 25—30 цэнтнераў збожжа з гектара і 150—170 цэнтнераў бульбы, гэта рэкордныя паказчыкі таго часу. У 70-х гадах пачаўся сапраўдны росквіт гаспадаркі. Пра «Запаветы Леніна» загаварылі як пра калгас-мільянер. Сюды ехалі дзеля вопыту з усяго Савецкага Саюза, пра гаспадарку пісалі саюзныя і рэспубліканскія газеты. Два брыгадзіры паляводчых брыгад, трактарыст былі ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, ардэнаносцамі сталі галоўныя спецыялісты і радавыя працаўнікі. Сам Леанід Лявонаў за сваю працу быў адзначаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны». Яго былыя калегі, з кім давялося пагаварыць, лічаць, што іх старшыня цалкам заслугоўваў звання Героя Сацыялістычнай Працы. Але самі яны і дадуць тлумачэнне, чаму не атрымаў Зорку Героя хацісла́ўскі старшыня: «Сціплы быў па натуры чалавек, за ўзнагародамі не ганяўся». Можа яно і так, лепшай узнагародай сёння бачыцца павага і пашана, з якой ставяцца аднавяскоўцы да былога кіраўніка калгаса. Былы брыгадзір брыгады Сушытніца, з якім давялося пагаварыць, Лявонцій Смаль сказаў, што Леанід Іванавіч запомніўся як надзвычай інтэлігентны кіраўнік, добразычлівасць была яго прынцыпам работы. У яго вучыліся ўсе калегі.

Галоўным дасягненнем калгаса-мільянера той пары стаў дабрабыт калгаснікаў. А вытворча-сацыяльнай базай, узведзенай пры Лявонаве, сельгаспрадпрыемства «Хацісла́ўскі» карыстаецца і цяпер.

Паводле прызнання былога старшыні, нялёгкімі для гаспадаркі былі 1990-я гады. Але Лявонаў з калегамі-аднадумцамі здолелі ўтрымаць калгас, не толькі не дапусцілі развалу, але пакінулі яго прыбытковым наступнікам. Гэта было ў 2001-м.

— Мне пайшоў 71-ы год. Стаў заўважаць, што адстаю ад маладых у інфармаванасці, у творчасці, рашыў, што трэба саступаць маладым і сам напісаў заяву, — гаворыць шаноўны ветэран — Усціння падтрымала.

## Разам 66 гадоў

Варта сказаць і пра жанчыну, без якой хацісла́ўскі старшыня наўрад ці дабіўся б такіх вынікаў у рабоце. Гэта сяброўка ўсяго яго жыцця — Усціння Фёдараўна. Калі ён прыехаў у вёску, яна працавала старшынёй сельскага Савета, замяніла былога актывіста, старшыню, які загінуў ад бандыцкай кулі. Ёй нават самой тады прапаноўвалі ўзначаліць калгас, але дзяўчына наадрэз адмовілася. Як аказалася, нездарма. Старшыня, якога прыслалі, і стаў яе лёсам. Пажаніліся яны ў 1954 годзе, яна адразу пакінула сельсавет, перайшла на работу на пошту. Там і працавала да выхаду на пенсію. Разам яны выгадавалі траіх дзяцей, дачакаліся ўнукаў, праўнукаў. Сын і дачка Лявонавых жывуць у Брэсце, малодшы сын у Маларыце. Унукі не забываюць бабулю з дзядулем, мінскія ўнучкі нярэдка заязджаюць у вёску — гавораць сужэнцы.

Яны ж з Усціняй у горад не хочуць, засталіся жыць у сваім доме. «Уключыш тэлевізар, паглядзіш — жыццё ідзе, свет развіваецца, а ты ўжо, здаецца, убаку ад гэтага свету, на ўзбочыне жыцця, — па-філасофску разважае Леанід Іванавіч. — Добра толькі, што мы ўдваіх, што адно аднаго падтрымліваем».

Насамрэч ён уважліва сочыць за ўсімі падзеямі: на стале ляжыць стос свежых газет. І яшчэ, што кінулася ў вочы, вялікая бібліятэка, якую Лявонавы збіралі доўгія гады. У іх сціплым доме са сціплай абстаноўкай гэтыя кніжныя шафы красамоўна сведчаць аб прыярытэтах гаспадароў. Праўда, зараз Леанід Іванавіч чытае толькі перыёдыку, зрок стаў падводзіць.

У снежні Леанід Лявонаў адзначыў 90-гадовы юбілей. Ганаровага грамадзяніна Маларыцкага раёна прыехалі павіншаваць кіраўнікі раёна, былыя калегі, вучні. Згадалі, што ўсе свае 48 старшынёўскіх гадоў Лявонаў жыў клопатам пра калгас і пра вёску, якая пры яго рабоце набыла новае аблічча.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Маларыцкі раён.*
**Фота з асабістага архіва Леаніда ЛЯВОНАВА.**

Навінка

# Хуткасць — другое імя Паднябеснай




Выдавецкі дом «Звязда» па традыцыі ўважлівы да кітайскай тэмы. Следам за мастацкімі кнігамі, якія паказваюць характар кітайцаў і Кітая, творамі Лі Бо, Ду Фу, Ван Гачжэня, іншых пісьменнікаў, перакладзенымі на беларускую мову, з'явіліся дакументальныя навінкі, прысвечаныя рабоце нашых дыпламатаў у Кітаі, а таксама кітайскіх дыпламатаў — у Беларусі, іншыя выданні, у тым ліку і кніга доктара эканамічных навук Кірыла Рудага пра Кітай і беларуска-кітайскія адносіны на сучасным этапе. І вось — яшчэ адна кніжная навінка.

*...Мінчанка пытаецца ў масквічкі, якая прыехала да яе ў госці:*

*— Вось скажы мне, колькі праз дваццаць гадоў будзе каштаваць бохан хлеба ў Маскве?*

*— Не ведаю.*

*— Не, ну ты падумай.*

*— Не магу ўявіць.*

*— Ха! — выдае мінчанка пераможны вокліч. — Дваццаць юаняў!*

Такі анекдот цытуе **аўтар кнігі «Як разгадаць Кітай» журналістка-міжнародніца Інеса ПЛЕСКАЧЭЎСКАЯ.** Зборнік яе артыкулаў, нарысаў, карэспандэнцый, эсэ толькі што ўбачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда».

Інеса Плескачэўская доўгі час працавала ў Паднябеснай уласным карэспандэнтам газеты «СБ. Беларусь сегодня». І за гэтыя гады, зразумела, і для сябе, і для свайго чытача задавалася галоўным пытаннем: «Як адкрыць, як спасцігнуць менталітэт кітайцаў? Як зразумець, што дапамагае ім так інтэнсіўна рухацца ў сваім развіцці?». «Кітай, канешне ж, больш круты, чым Еўропа. Усё там — скіраванасць у будучыню, тэмп, энергія цераз край. Імкненні быць на ўсім першымі. Хуткасць — другое імя Паднябеснай. Працягласць хуткасных чыгунак большая, чым ва ўсёй Еўропе разам узятай. А калі я туды прыехала, такіх дарог не было ўвогуле. Гэта паказальна: Еўропа ў прынцыпе больш павольная». І далей: «Найноўшыя тэхналогіі, электронныя навінкі — гэта пра Кітай. Усё самае новае, што з'яўляецца на гэтым рынку ў свеце, адразу ёсць у Кітаі — хоць бы таму, што тут гэта і вырабляецца. Кітайцы жадаюць мець усё самае-самае, любы вулічны прыбіральшчык смецця — шчаслівы ўладальнік iPhone ці iPad».

Багата ілюстраваная кніга Інесы Плескачэўскай — магчымасць ажыццявіць унікальнае віртуальнае падарожжа па КНР ды следам займець мару ажыццявіць паездку ў Кітай, магчыма, на вучобу альбо работу. Такіх магчымасцяў сёння больш чым дастаткова, хіба што пандэмічная сітуацыя іх стрымлівае. Але прыйдзе і новы, свабодны ад розных абмежаванняў час. Так што зазірніце на старонкі «Як разгадаць Кітай» — не пашкадуеце.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ИТОГИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Играй с BAMBOLINA»

**Организатор рекламной игры:** Общество с ограниченной ответственностью «Минт филд» (далее именуемое «Организатор»), 220150, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, пом. 22, этаж 5, ком. 506, УНП 192465627.

**Наименование рекламной игры** – «Играй с BAMBOLINA».

**Срок начала рекламной игры** – 10 октября 2020 года, **срок окончания** – 25 января 2021 года.

Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 1 сентября 2020 г., свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3847.

Количество участников, принявших участие в рекламной игре – 3314.

Призовой фонд разыгран полностью.

## НАШИ ПОБЕДИТЕЛИ:

### Победители первого розыгрыша, состоявшийся 16.10.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. СЕРЕБРЯНАЯ НАТАЛЬЯ ЮРЬЕВНА;
2. СЕРЕБРЯНАЯ НАТАЛЬЯ ЮРЬЕВНА;
3. КИСЛЯК ОКСАНА ВИКТОРОВНА;
4. ГЛЕБ ЕЛЕНА СЕРГЕЕВНА;
5. ФОМИЧЕВА АЛИНА ЮРЬЕВНА;
6. ФОМИЧЕВА АЛИНА ЮРЬЕВНА;
7. ГРИБОВСКАЯ ГАЛИНА ИВАНОВНА;
8. ГАЙКЕВИЧ АНАСТАСИЯ МИХАЙЛОВНА;
9. ГРИБОВСКАЯ ГАЛИНА ИВАНОВНА;
10. КУРАЛЕНКО ВИКТОР АЛЕКСАНДРОВИЧ.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ВОРОБЬЁВА ЮЛИЯ ВАЛЕРЬЕВНА;
2. ВАСИЛЕНКО МАРИНА СЕРГЕЕВНА;
3. ЦАЛКО ОЛЕСЯ НИКОЛАЕВНА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. СЕРЕБРЯНАЯ НАТАЛЬЯ ЮРЬЕВНА;
2. ВОТЯКОВА ЛИЛИЯ ПАВЛОВНА;
3. КИСЛЯК ОКСАНА ВИКТОРОВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ШТОП АНЖЕЛА ВЛАДИМИРОВНА;
2. ЮХО ВЕРОНИКА ГЕННАДЬЕВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. СЕРЕБРЯНАЯ НАТАЛЬЯ ЮРЬЕВНА;
2. КЛЕПЧА ОЛЬГА ВЛАДИМИРОВНА.

### Победители второго розыгрыша, состоявшегося 23.10.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. ПАРЧУК СВЕТЛАНА СЕРГЕЕВНА;
2. БРАЗИНСКАЯ ГАЛИНА АЛЕКСЕЕВНА;
3. ЧУЛЬЦОВ АЛЕКСАНДР АНАТОЛЬЕВИЧ;
4. САРАФАНОВА ИРИНА ЛЕОНИДОВНА;
5. ЛАЙКОВА ТАТЬЯНА ВАСИЛЬЕВНА;
6. ГОРБАЧОНОК АНАСТАСИЯ РОМАНОВНА;
7. ЕРМОЛОВИЧ МАРИНА ВЛАДИМИРОВНА;
8. ГОПША АНАСТАСИЯ СЕРГЕЕВНА;
9. БОГДАНОВИЧ АНАСТАСИЯ ВАЛЕРЬЕВНА;
10. ЮХО ВЕРОНИКА ГЕННАДЬЕВНА.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. БАБКОВА АНАСТАСИЯ ВАЛЕРЬЕВНА;
2. ШИБУН АНТОН НИКОЛАЕВИЧ;
3. КАРПУТОВА ВИКТОРИЯ НИКОЛАЕВНА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЕРМОЛОВИЧ МАРИНА ВЛАДИМИРОВНА;
2. КАРПУТОВА ВИКТОРИЯ НИКОЛАЕВНА;
3. ЮХО ВЕРОНИКА ГЕННАДЬЕВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ТАРАСЕНКО ЕВГЕНИЯ ВАСИЛЬЕВНА;
2. ЯРОЦКАЯ ОЛЬГА ОЛЕГОВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. РОМАНОВСКИЙ ОЛЕГ НИКОЛАЕВИЧ;
2. САНЦЕВИЧ ЕЛЕНА ВАСИЛЬЕВНА.

### Победители третьего розыгрыша, состоявшегося 30.10.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. ГОПША АНАСТАСИЯ СЕРГЕЕВНА;
2. ГНЁТОВ ВИТАЛИЙ НИКОЛАЕВИЧ;
3. САЛАНОВИЧ ТАТЬЯНА НИКОЛАЕВНА;
4. ПОЛХОВСКАЯ ЕЛЕНА АЛЕКСАНДРОВНА;
5. ЛУКАШЕВИЧ ДАРЬЯ ЮРЬЕВНА;
6. АНАНЧЕНКО ОЛЬГА ПЕТРОВНА;
7. ХВОСТЁНОК ЗОЯ ИВАНОВНА;
8. ШАРКОВСКИЙ ДМИТРИЙ МИХАЙЛОВИЧ;
9. МУХА АЛИНА АЛЕКСЕЕВНА;
10. ЮХО ВЕРОНИКА ГЕННАДЬЕВНА.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЛЕНКЕВИЧ НАТАЛЬЯ ВИКТОРОВНА;
2. КЛЕПЧА ОЛЬГА ВЛАДИМИРОВНА;
3. МАМОНЕНКО ЮЛИЯ ЮРЬЕВНА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ПЕТРОВСКАЯ ОЛЬГА СЕРГЕЕВНА;
2. ИВАНОВА ВИКТОРИЯ ВИТАЛЬЕВНА;
3. ГИРИН ЕВГЕНИЙ ВИКТОРОВИЧ.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ПАВЛЮКЕВИЧ ВИРИНЕЯ ВАДИМОВНА;
2. ГАЛАКТИОНОВА МАРИЯ НИКОЛАЕВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. КИСЛЯК ОКСАНА ВИКТОРОВНА;
2. ЛЕСИКОВА ЕКАТЕРИНА АЛЕКСАНДРОВНА.

### Победители четвертого розыгрыша, состоявшегося 06.11.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. КЛИМОВИЧ ИРИНА ВАСИЛЬЕВНА;
2. СЕРЕБРЯНАЯ НАТАЛЬЯ ЮРЬЕВНА;
3. ЛАЗОВСКАЯ АННА ГЕОРГИЕВНА;
4. КАСТРИЦКАЯ ЕКАТЕРИНА АЛЕКСАНДРОВНА;
5. ЛАЗОВСКАЯ АННА ГЕОРГИЕВНА;
6. ЛЕНКЕВИЧ НАТАЛЬЯ ВИКТОРОВНА;
7. КОЛАНДО ИЛОНА ИВАНОВНА;
8. ШАБАН АЛЕКСЕЙ ВЛАДИМИРОВИЧ;
9. ЮХО ВЕРОНИКА ГЕННАДЬЕВНА;
10. ХОБОТОВА ДАРЬЯ ИВАНОВНА.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. БУРМИСТРОНОК ОЛЬГА ВАСИЛЬЕВНА;
2. АТРОЩЕНКО НАТАЛЬЯ ПЕТРОВНА;
3. ДЫЛЬКОВ ДЕНИС СЕРГЕЕВИЧ.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. АНАНЬИНА АНАСТАСИЯ СЕРГЕЕВНА;
2. ТУМАШИК СВЕТЛАНА ФЁДОРОВНА;
3. ГАБЕЦ ИРИНА ВИКТОРОВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. КОЛАНДО ИЛОНА ИВАНОВНА;
2. БЕЛЬСКАЯ ИННА НИКОЛАЕВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ГЕРАСИМОВА МАРИЯ АЛЕКСАНДРОВНА;
2. КОСТЮКЕВИЧ ОЛЬГА ПЕТРОВНА.

### Победитель первого промежуточного розыгрыша, состоявшегося 07.11.2020

**Приз 6 – Денежные средства в сумме 1 129,85 (одна тысяча сто двадцать девять) белорусских рублей 85 копеек:**
1. ВЕРГЕЙЧИК ДЕНИС МИХАЙЛОВИЧ.

### Победители пятого розыгрыша, состоявшегося 13.11.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. ГОПША АНАСТАСИЯ СЕРГЕЕВНА;
2. КАЗАКОВА СВЕТЛАНА АЛЕКСАНДРОВНА;
3. МИЦКЕВИЧ ЮЛИЯ ВАДИМОВНА;
4. ХОМЧЕНКО МАРИНА СЕРГЕЕВНА;
5. ЮХО ВЕРОНИКА ГЕННАДЬЕВНА;
6. КРАСНОВА ТАТЬЯНА СЕРГЕЕВНА;
7. ПАНЬКОВА ВЕРОНИКА ВЛАДИМИРОВНА;
8. САЧКЕВИЧ ЮЛИЯ ОЛЕГОВНА;
9. ОВЧИННИКОВ ВАСИЛИЙ НИКОЛАЕВИЧ;
10. ВЕТЧЕНКО ИРИНА ПЕТРОВНА.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. БУЙКО НАТАЛЬЯ АЛЕКСАНДРОВНА;
2. КОЗЛОВСКАЯ ВИКТОРИЯ ИГОРЕВНА;
3. ЗУБРИНОВИЧ ТАТЬЯНА ОЛЕГОВНА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЛУКША АНАСТАСИЯ ЛЕОНИДОВНА;
2. ИВАНОВА ВИКТОРИЯ ВИТАЛЬЕВНА;
3. КИСЕЛЬ ДАРЬЯ АНДРЕЕВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ШАПОВАЛОВ ВАЛЕНТИН МИХАЙЛОВИЧ;
2. КАМИНСКАЯ ЮЛИЯ АНДРЕЕВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. КОРОЗЕЕВА АННА СЕРГЕЕВНА;
2. БЕЛОУС ИРИНА ИВАНОВНА.

### Победители шестого розыгрыша, состоявшегося 20.11.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. ЛАЗОВСКАЯ АННА ГЕОРГИЕВНА;
2. САЛАНОВИЧ ТАТЬЯНА НИКОЛАЕВНА;
3. АРТЁМЕНКО ТАТЬЯНА ВЛАДИМИРОВНА;
4. ТАРАСЕВИЧ ОЛЬГА НИКОЛАЕВНА;
5. КОЗЛОВСКАЯ ИРИНА ЮРЬЕВНА;
6. ГАЦУКОВ ЕВГЕНИЙ НИКОЛАЕВИЧ;
7. ШЕВЦОВА ЕЛЕНА ВЛАДИМИРОВНА;
8. ЛЕВИЦКИЙ БОГДАН АЛЕКСЕЕВИЧ;
9. ЮДЕШКО ОКСАНА ЛЕОНИДОВНА;
10. ВАШКЕВИЧ АЛЕСЯ ПЕТРОВНА.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ПОТАПОВА ТАТЬЯНА АЛЕКСАНДРОВНА;
2. БУРЧ МАРИНА АЛЕКСАНДРОВНА;
3. ДАВИДЕНКО АННА АЛЕКСАНДРОВНА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. КУЧУРА ТАИСИЯ ЛЕОНИДОВНА;
2. ПОЛХОВСКАЯ ЕЛЕНА АЛЕКСАНДРОВНА;
3. ХАЛЬКО НАТАЛЬЯ ВИТАЛЬЕВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ШИШКО МАРИНА НИКОЛАЕВНА;
2. КУЗЬМЕНОК ОЛЕСЯ ВАЛЕРЬЕВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. СВИСТУН ИРИНА ЮРЬЕВНА;
2. КАДОВБ ОЛЬГА ВЛАДИМИРОВНА.

### Победители седьмого розыгрыша, состоявшегося 27.11.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. БОНДАРОВИЧ НАТАЛЬЯ МИХАЙЛОВНА;
2. ГАПОНЕНКО ЮЛИЯ СЕРГЕЕВНА;
3. МРЫХИНА ЕЛЕНА СЕРГЕЕВНА;
4. МАЗУРЕНКО АЛЕКСАНДРА ЮРЬЕВНА;
5. МОРОЗОВА ИРИНА ВИКТОРОВНА;
6. ЛЕВШУКОВА ЕКАТЕРИНА АЛЕКСАНДРОВНА;
7. ВЛАЩЕНКО НАТАЛЬЯ НИКОЛАЕВНА;
8. АДАМОВИЧ ОЛЬГА ИВАНОВНА;
9. БОГДАНОВИЧ ЕКАТЕРИНА СЕРГЕЕВНА;
10. ЛИСОВСКИЙ ВИТАЛИЙ ВИКТОРОВИЧ.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. СТРОГИНА КРИСТИНА СЕРГЕЕВНА;
2. БОЖКОВА ЕКАТЕРИНА ВИКТОРОВНА;
3. РЫЖКОВА ЕЛЕНА ЛЕОНИДОВНА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЧУБЕНКО ЕЛЕНА СЕРГЕЕВНА;
2. ЛАШУТКО ЭЛЬВИРА ПАВЛОВНА;
3. ПРОТАС ВЕРОНИКА ИВАНОВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЕРМАК ДАРЬЯ СЕРГЕЕВНА;
2. БУСЛАЕВА ОЛЬГА ОЛЕГОВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЛОГВИНОВА ОКСАНА ВЛАДИМИРОВНА;
2. СОНЕЦ ЮЛИЯ АЛЕКСАНДРОВНА.

### Победители восьмого розыгрыша, состоявшегося 04.12.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. КОМАРОВСКАЯ ВИКТОРИЯ КАЗИМИРОВНА;
2. ФОМИЧЕВА АЛИНА ЮРЬЕВНА;
3. КОТ АЛИНА ВЛАДИМИРОВНА;
4. БОРОВИКОВА ВИКТОРИЯ НИКОЛАЕВНА;
5. ДОРОШКИНА НАДЕЖДА НИКОЛАЕВНА;
6. ЛАШУТКО ЭЛЬВИРА ПАВЛОВНА;
7. ПУЛЬЯНОВ ВАДИМ ВАЛЕРЬЕВИЧ;
8. ГРИЦКО НИКОЛАЙ ДМИТРИЕВИЧ;
9. БЕЛОВА АНАСТАСИЯ РОМАНОВНА ;
10. САНДРОЗДОВА ТАТЬЯНА НИКОЛАЕВНА.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ПАПКО ЕКАТЕРИНА НИКОЛАЕВНА;
2. СЫРЦОВА ЕЛЕНА АЛЕКСАНДРОВНА;
3. ПЫШИНСКАЯ ЕЛЕНА СЕРГЕЕВНА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. КУХАРЁНОК ОЛЬГА ВЛАДИМИРОВНА;
2. ГАЛЬПЕРИНА ДАРЬЯ ВИКТОРОВНА;
3. ХАЛЬКО НАТАЛЬЯ ВИТАЛЬЕВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ДРАГУНОВА ЛИДИЯ ВЛАДИМИРОВНА;
2. ПАРАХНЕВИЧ НАТАЛЬЯ ИВАНОВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ШАРКОВСКАЯ ВИКТОРИЯ ВИКТОРОВНА;
2. ГОЛУБ ЕКАТЕРИНА АЛЕКСЕЕВНА.

### Победитель второго промежуточного розыгрыша, состоявшегося 05.12.2020

**Приз 6 – Денежные средства в сумме 1 129,85 (одна тысяча сто двадцать девять) белорусских рублей 85 копеек:**
1. ШАХОВИЧ НАТАЛЬЯ НИКОЛАЕВНА.

### Победители девятого розыгрыша, состоявшегося 11.12.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. ЕСИС ТАТЬЯНА ЮРЬЕВНА;
2. МЕЛЬГУЙ АНДРЕЙ АЛЕКСАНДРОВИЧ;
3. ЧМЫХОВА ВИОЛЕТТА АЛЕКСАНДРОВНА;
4. ТРЕТЬЯК ВИКТОРИЯ АЛЕКСАНДРОВНА;
5. РАМАНОВИЧ ТАТЬЯНА МЕЧИСЛАВОВНА;
6. КИСЕЛЕВИЧ ТАТЬЯНА АНАТОЛЬЕВНА;
7. КОЗЛОВА ИРИНА ПАВЛОВНА;
8. КРИВАЛЬЦЕВИЧ ОЛЬГА СЕРГЕЕВНА;
9. ЛАШУТКО ЭЛЬВИРА ПАВЛОВНА;
10. БУКШТА СЕРГЕЙ АЛЕКСАНДРОВИЧ.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЛАПОРЕВИЧ МАРИЯ СЕРГЕЕВНА;
2. ВОЛЖАНКОВА ЕКАТЕРИНА АЛЕКСАНДРОВНА;
3. МАЛАШЕВИЧ ИРИНА ВАЛЕНТИНОВНА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЗАЙЦЕВА ОЛЬГА ВЛАДИМИРОВНА;
2. ПАВЛЮЧЕНКО ЕЛЕНА ЛЕОНИДОВНА;
3. ЗАЗЫБА ОЛЬГА ВИКТОРОВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЖЕЧКО ТАТЬЯНА ПАВЛОВНА;
2. СИМАНКОВА СТЕЛЛА ЛЕОНИДОВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ГАЦУКОВ ЕВГЕНИЙ НИКОЛАЕВИЧ;
2. ВОДЧИЦ АЛЕСЯ АЛЕКСАНДРОВНА.

### Победители десятого розыгрыша, состоявшегося 18.12.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. ЛАНЕЦ ЕЛЕНА ВИКТОРОВНА;
2. ПОЛХОВСКАЯ ЕЛЕНА АЛЕКСАНДРОВНА;
3. АБРАМЧУК НАТАЛЬЯ СЕРГЕЕВНА;
4. ГАЙЛЮН ИРИНА АНДРЕЕВНА;
5. ПУЛЬМАНОВСКАЯ АНАСТАСИЯ ДМИТРИЕВНА;
6. ВЕРГЕЙЧИК ДЕНИС МИХАЙЛОВИЧ;
7. ВОРОБЬЁВА ЮЛИЯ ВАЛЕРЬЕВНА;
8. КАЛИХ ОЛЬГА СТАНИСЛАВОВНА;
9. ЧМЫХОВА ВИОЛЕТТА АЛЕКСАНДРОВНА;
10. МИРОШНИЧЕНКО АНТОН ОЛЕГОВИЧ.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЦУПА ТАТЬЯНА ВИКТОРОВНА;
2. ФЕДОРОВ ПАВЕЛ МЕЧИСЛАВОВИЧ;
3. ЧЕРНЫШОВА ОЛЬГА НИКОЛАЕВА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. КУЧИНСКАЯ ЯНА АЛЕКСАНДРОВНА;
2. СИКОРА МАРИНА СЕРГЕЕВНА;
3. ЦАЙ ЕЛИЗАВЕТА АЛЕКСАНДРОВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. БОЖКО ВЕРОНИКА ВЛАДИМИРОВНА;
2. КОЖЕВКО НАДЕЖДА СЕРГЕЕВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ВЫДРЕНКОВА ВИКТОРИЯ ИГОРЕВНА;
2. САДОВСКАЯ ЕЛЕНА АНТОНОВНА.

### Победители одиннадцатого розыгрыша, состоявшегося 25.12.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. МАСЛАКОВА ВЕРОНИКА ВЛАДИМИРОВНА;
2. ШИХАНЦОВ ЛЕОНИД АНАТОЛЬЕВИЧ;
3. КУЛАГА НАТАЛЬЯ НИКОЛАЕВНА;
4. ПРОКОПЧИК НИКОЛАЙ НИКОЛАЕВИЧ;
5. ЛУПИНА НАТАЛЬЯ АЛЕКСАНДРОВНА;
6. ГЕРАСИМОВА МАРИЯ АЛЕКСАНДРОВНА;
7. МАРТИНЧИК ЛЮДМИЛА СЕРГЕЕВНА;
8. РОМАНЦОВА ТАТЬЯНА ВАЛЕНТИНОВНА;
9. СКОРОЧКИНА АЛЕСЯ АЛЕКСАНДРОВНА;
10. БУРМИСТРОНОК ОЛЬГА ВАСИЛЬЕВНА.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ПАВЛЮКЕВИЧ ВИРИНЕЯ ВАДИМОВНА;
2. АСТАПЕНКО ТАТЬЯНА АЛЕКСАНДРОВНА;
3. АДАМОВИЧ ОЛЬГА ИВАНОВНА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ПРОКОПЧИК НИКОЛАЙ НИКОЛАЕВИЧ;
2. БОГДАНОВИЧ ЕКАТЕРИНА СЕРГЕЕВНА;
3. БУЛАНОВА ОЛЬГА ВИКТОРОВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЧЕРЕПКО ЕЛЕНА ВАСИЛЬЕВНА;
2. ЛУКАШЕВИЧ ДАРЬЯ ЮРЬЕВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЮХО ВЕРОНИКА ГЕННАДЬЕВНА;
2. ШЕДКО СВЕТЛАНА ЛЕОНИДОВНА.

### Победители двенадцатого розыгрыша, состоявшегося 31.12.2020

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. ФЕДОРИНЧИК МАРИНА СТАНИСЛАВОВНА;
2. ЛАНСКАЯ ГАЛИНА МИХАЙЛОВНА;
3. САВЧЕНКО ОЛЬГА АЛЕКСАНДРОВНА;
4. ЛУКАШИК ВИКТОРИЯ ВАСИЛЬЕВНА;
5. ВЕРАКСО АЛЕКСАНДРА СЕРГЕЕВНА;
6. ПАНКЕВИЧ ГАЛИНА ЮРЬЕВНА;
7. МАЛЫШЕВА СВЕТЛАНА ЮРЬЕВНА;
8. ВЕРАКСО АЛЕКСАНДРА СЕРГЕЕВНА;
9. ПАВЛОВСКАЯ НАТАЛИЯ ЛЕОНИДОВНА;
10. МУХИНА ТАТЬЯНА НИКОЛАЕВНА.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. КОШМАР ЕВГЕНИЙ АНАТОЛЬЕВИЧ;
2. АДАМОВИЧ ОЛЬГА ИВАНОВНА;
3. ПОГОНЯЙЛО ДАРЬЯ АЛЕКСЕЕВНА.

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. КМЕЦ ОЛЬГА ВАСИЛЬЕВНА;
2. МИРОНЧИК АНАСТАСИЯ АЛЕКСАНДРОВНА;
3. ШИБКО ИРИНА ИВАНОВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. АБРАМЧУК НАТАЛЬЯ СЕРГЕЕВНА;
2. ЦУПА ТАТЬЯНА ВИКТОРОВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ГРОМЫКО ЮЛИЯ ИВАНОВНА;
2. КУНДАС АННА ГЕНРИХОВНА.

### Победители тринадцатого розыгрыша, состоявшегося 08.01.2021

**Приз 1 – денежные средства в сумме 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:**
1. ЮДИНА ИННА НИКОЛАЕВНА;
2. ФИЛИПЕНКО ИРИНА АЛЕКСЕЕВНА;
3. ГОПША АНАСТАСИЯ СЕРГЕЕВНА;
4. ГИГЕВИЧ ЕКАТЕРИНА АНАТОЛЬЕВНА;
5. КУРЬЯНОВИЧ ЕКАТЕРИНА СЕРГЕЕВНА;
6. ЕРМАК ДАРЬЯ СЕРГЕЕВНА;
7. ЧЕРЕПКО ЕЛЕНА ВАСИЛЬЕВНА;
8. САЛАНОВИЧ ТАТЬЯНА НИКОЛАЕВНА;
9. КАРПУТОВА ВИКТОРИЯ НИКОЛАЕВНА;
10. ДАСЮКЕВИЧ СВЕТЛАНА ИОСИФОВНА.

**Приз 2 – «Овечка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЮДЕШКО ОКСАНА ЛЕОНИДОВНА;
2. ШИРКО НАТАЛИЯ ЛЕОНИДОВНА;
3. ЯХИМЧИК ЛИЛИЯ ИГОРЕВНА

**Приз 3 – «Зайка» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. СМЕРТИНА ДАРЬЯ ПЕТРОВНА;
2. ГРАЧЁВА ПОЛИНА СТАНИСЛАВОВНА;
3. КАЛИХ ОЛЬГА СТАНИСЛАВОВНА.

**Приз 4 – «Лиса» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. ЛАЗОВСКАЯ АННА ГЕОРГИЕВНА;
2. ТЕЛЬНАЯ ЯНИНА ВЛАДИМИРОВНА.

**Приз 5 – «Медвежонок» — украшение для интерьера, ручная работа:**
1. МОЛОЧКО ЕКАТЕРИНА ВАСИЛЬЕВНА;
2. ГРИЦКО НИКОЛАЙ ДМИТРИЕВИЧ.

### Победитель третьего промежуточного розыгрыша, состоявшегося 09.01.2021

**Приз 6 – Денежные средства в сумме 1 129,85 (одна тысяча сто двадцать девять) белорусских рублей 85 копеек:**
1. ГОРБУНОВА ТАТЬЯНА ГЕННАДЬЕВНА.

### Победитель розыгрыша главного приза, разыгранного 09.01.2021

**Главный приз – Денежные средства в сумме 3 428,70 (три тысячи четыреста двадцать восемь) белорусских рублей 70 копеек:**
1. ЦАРЬ ИРИНА МИХАЙЛОВНА.

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375296809126.**

**Поздравляем победителей и благодарим всех за участие в рекламной игре «Играй с BAMBOLINA»**

Кніжны гасцінец

# Пра самурайскі дух, прыгажосць смерці і неабходнасць спачування

**Ваўчыца з Чортавай ямы. 25 апавяданняў пра жывёл. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2020**




Ці не самыя кранальныя літаратурныя творы — тыя, што пра жывёл... «Кліч продкаў» Джэка Лондана, «Халстамер» Льва Талстога, «Белы пудзель» Купрына, «Каштанка» Чэхава, «Рыкі-Цікі-Таві» Кіплінга... Ёсць падобныя і ў беларускай літаратуры, найлепшыя з іх сабраны ў прыведзеным зборніку. Часам гэта забаўна, часам — уражальная трагедыя... Як апавяданне Барыса Сачанкі, якое дало назву зборніку, прысвечанае, дарэчы, Івану Мележу. Малады вясковец Іван знаходзіць логава з ваўчанятамі і забірае ўсіх семярых... Спачатку гадуе, потым, напалоханы нараканнямі аднавяскоўцаў, здае ў лягчас... Другая частка апавядання — вачыма маці ваўчанят, якая шукае, бядуе, а пасля жорстка помсціць... А ў культавым апавяданні Міхася Стральцова «Смаленне вепрука» згаданы вяпрук робіцца сімвалам, філасофскім вобразам, а роздум тут ідзе пра душу беларуса. Уладзімір Караткевіч напісаў «Лясную гісторыю» пра забойства апошняга ў лесе ласія. Атрымалася эпічна. «Сябры мае, у той вечар мы яшчэ раз атрымалі горкі доказ таго, што прагнасць нічога не шкадуе. Крычаў лось, скардзіўся на самоту пад вялізным месяцам. І раптам цішыню прарэзаў далёкі-далёкі стрэл. І адразу стала цішыня, як быццам памерла нешта вельмі важлівае на зямлі. Памерла сумленне». Забойца атрымлівае пакаранне — пагарду людзей. А заканчваецца ўсё запаветам — «Мір вам, звяры. І мір вам, людзі». Думаю, гэтае ж цалкам каляднае выслоўе маглі прамовіць і іншыя аўтары зборніка — Вячаслаў Адамчык, Янка Брыль, Алена Васілевіч, Уладзімір Дамашэвіч, Алег Ждан, Аляксей Карпюк, Іван Пташнікаў, Янка Маўр, Іван Навуменка ды іншыя выдатныя майстры слова. Зімовымі вечарамі вельмі карысна паразважаць на тэму спачування і адказнасці за іншых.

**Юкія Місіма. Марак, якога разлюбіла мора. Масква, «Азбука-Класика», 2020**




Місіма — не той аўтар, якога можна параіць, каб прыемна пабавіць час за чытвом.

Як немагчыма аднесці словы «прыемнае чытво», скажам, да «Уладара мух» Голдынга. Адзін з нядаўніх чытачоў занатаваў: «Кніга відавочна не для людзей са слабымі нервамі... Але чытаць неабходна, каб не было «лёгка жыць з заплюшчанымі вачыма». А вось яшчэ адзін водгук: «Чалавек, які не чытаў гэтай кнігі, не мае права лічыць, што ён нешта ведае пра самурайскі дух і прыгажосць смерці».

Магчыма, для лепшага разумення таго, што пісаў Місіма, які тройчы намінаваўся на Нобелеўскую прэмію і чые творы шматкроць забараняліся, трэба трохі ведаць ягоную біяграфію. Жорсткі бацька, ізаляцыя ад равеснікаў, хваравітасць. У юнацтве, спалучаючы чыноўніцкую работу і літаратарскую, давёў сябе да знясілення так, што страціў прытомнасць на платформе чыгункі і зваліўся на рэйкі. Захапленне самурайскімі ідэямі. Бодзібілдынг. Скандальная слава. А ў 1970-м — спроба бессэнсоўнага паўстання дзеля аднаўлення манархіі, захоп вайсковай базы, зварот з балкона да жаўнераў і харакіры. Смерць мусіць быць прыгожай. Гэты лейтматыў гучыць і ў рамане «Марак, якога разлюбіла мора». Кожны павінен імкнуцца стаць героем... А як выбіраеш звычайнае панылае існаванне — усё, не варты жыцця... Гэтак перакананы падлетак Набару, чый бацька загінуў, і яго групоўка. Мілыя дзеткі з паспяховых сем'яў ненавідзяць свет, зладжаны няправільна, яны імкнуцца пазбавіцца пачуццяў, таму што праз пачуцці дарослыя імі маніпулююць. «Школа — гэта калька з грамадства... Вось чаму нам увесь час загадваюць. Прычым загадваюць нам сляпыя, якія нават не падазраюць пра нашы бязмежныя магчымасці», — вяшчае Правадыр групоўкі. Марскі афіцэр Рудзі, які заляцаецца да маці Набару, спачатку ўспрымаецца хлопчыкам як герой. Рудзі сапраўды незвычайны чалавек, самотны, замкнёны, мройлівы, перакананы ва ўласнай абранасці. «Бо калі ты мужчына, дык аднойчы, калі ў цемры перад узыходам сонца прагучыць самотны празрысты горн, нізка апусцяцца густыя аблокі і далёкі цвёрды голас назаве тваё імя, ты пакінеш усё і пойдзеш насустрач тваймy лёсу». Яшчэ Рудзі лічыць, што на шляху да найлепшай жанчыны абавязкова стаіць смерць... Уласна кажучы, так і выйшла. Марак знаёміцца з Фусако, маці Набару, якая загадвае крамай і вельмі практычна глядзіць на жыццё. Абодва разлічвалі на раман без абавязацельстваў. Абодва перажываюць жарсць і адважваюцца на шлюб. Рудзі вырашае адмовіцца ад мора і дапамагаць Фусако ў краме. Ну і, вядома, стаць бацькам для Набару. А для падлетка Рудзі — злачынец, бо адмовіўся быць героем, адрокся ад гульні са смерцю. Значыць, ператорыцца ў нуднага дарослага, які будзе вучыць жыць. І падлеткавая кампанія прыгаворвае будучага айчыма Набару да смерці. І, будзьце ўпэўнены, яны гэта здзейсняць — прадумана і рытуальна.

Жорсткасць сюжэту — і дасканалая прыгажосць мастацкага ўвасаблення. Місіма — самы чытаны ў свеце японскі пісьменнік, апярэджвае нават Муракамі... А гэта пра штосьці гаворыць.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

**Выданні для агляду прапанаваныя кніжным магазінам «Акадэмічная кніга», Мінск, пр. Незалежнасці, 72.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.13 | 17.30 | 8.17 |
| Віцебск — | 9.08 | 17.14 | 8.06 |
| Магілёў — | 9.03 | 17.20 | 8.17 |
| Гомель — | 8.53 | 17.23 | 8.30 |
| Гродна — | 9.27 | 17.46 | 8.19 |
| Брэст — | 9.21 | 17.53 | 8.32 |

### Месяц

*Першая квадра ў 0.02.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

*Пр. Антона, Васілісы, Віктара, Георгія, Емяльяна, Ільі, Міхаіла, Рыгора, Сідара.*
*К. Агнешкі, Аўгуста, Інесы, Людвіка, Яраслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— У вас такія прыгожыя зубы...
— Гэта ад мамы.
— І так падышлі!

**— Чаму ты не патрабуеш у Глеба вярнуць нам доўг? Ужо паўгода прайшло!**
**— Па-першае, Глеб памёр два месяцы таму.**
**— А па-другое?**

— Калі ты не перастанеш паводзіць сябе як касірка з супермаркета, я сыду ад цябе!
— Пакецік браць будзеце?

**— У XVI стагоддзі цябе б спалілі на вогнішчы!**
**— Нібыта я ведзьма?**
**— Нібыта ты бервяно!**




Даты | Падзеі | Людзі

### 21 СТУДЗЕНЯ

**У краіне**

**1926** год — нарадзілася Ніна Адольфаўна Азоліна, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Обальскага патрыятычнага падполля, удзельніца партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1943-м арыштаваная разам з многімі падпольшчыкамі і расстраляная.

**1941** год — нарадзіўся Віктар Ігнатавіч Кліменка, беларускі мастак.

**1951** год — нарадзілася Ганна Станіславаўна Халшчанкова, спявачка, заслужаная артыстка Беларусі. У фондах радыё запісана больш за 500 песень у яе выкананні.

**1981** год — нарадзілася Анастасія Аляксандраўна Зварыка, беларуская спартсменка (мастацкая гімнастыка), заслужаны майстар спорту Беларусі.

**2001** год — у Маскве на Алеі зорак закладзена «зорка» кіраўніка Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры» народнага артыста Беларусі і СССР Уладзіміра Мулявіна.

**У свеце**

**1906** год — нарадзіўся Ігар Аляксандравіч Майсееў, рускі артыст балета, балетмайстар, арганізатар і нязменны мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля народнага танца, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Лаўрэат Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР (чатыры разы), Дзяржаўнай прэміі РСФСР. Уладальнік мноства прэстыжных замежных узнагарод.



**1921** год — Саўнаркам прыняў дэкрэт «Аб сацыяльным забеспячэнні рабочых і служачых і членаў іх сямействаў».

**1941** год — нарадзіўся Пласіда Дамінга, іспанскі спявак (тэнар), оперны дырыжор, мастацкі кіраўнік опернага тэатра Лос-Анджэлеса.

**Так гаварыў...**

**БЕНДЖАМІН ФРАНКЛІН:**

*«Шлюб без кахання вядзе да кахання без шлюбу».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 167.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 20 студзеня 2021 года.